440
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИН. ТУТ
СОВ. СТРОИТ. И ПРАВА
3 1.12

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 77 (5751) | 3 красавіка 1937 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

„... У барацьбе з сучасным трацкізмам патрэбны цяпер не старыя метады, не метады дыскусіі, а новыя метады, метады выкарчоўвання і разгрому“.

(З даклада таварыша СТАЛІНА на Пленуме ЦК ВКП(б)

РАЗГАРНУЦЬ СЯЎБУ У ПАЎДНЁВЫХ РАЁНАХ РЭСПУБЛІКІ

Многія калгасы паўднёвых раёнаў ўжо разгарнулі сяўбу. Напрыклад, калгас «Рухавік рэволюцыі» Камарынскага раёна ўжо некалькі дзён таму назад распачаў сяўбу. Брыгада т. Хірэнкі Аксені закончыла ўжо сяўбу ячменю і аўса. У калгасах «Гігант», «Чырвоны партызан» і імя Кірава Петрыкаўскага раёна пасеялі ўжо яравое жыта. Калгас «Новае жыццё», гэтага-ж раёна, засеяў першыя гектары ільну. Ва ўсіх амаль паўднёвых раёнах больш перадавыя калгасы распачалі сяўбу яравых.

Зямля ў паўднёвых раёнах рэспублікі ўжо падсохла і гатова да сяўбы. Сеяць можна ўжо не толькі на асобных участках. У Камарынскім, Ельскім, Лельчыцкім, Нараўлянскім, Петрыкаўскім, Хойніцкім, Мозырскім, Лоеўскім, Тураўскім, Жыткавіцкім, Брагінскім, Церахаўскім раёнах можна і павінна ўжо быць разгорнута масавая сяўба.

На раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі, на старшынь райвыканкомаў, сакратароў РК КП(б)Б, загадчыкаў райземаддзелаў і дырэктароў МТС усклядаецца выключна велізарнейшая адказнасць за паспяховае правядзенне гэтай кампаніі. Ад іх патрабуецца зараз выключная аператыўнасць, каб, разгортваючы масавую сяўбу, на ходу ліквідаваць розныя непаладкі і недаробкі, якія могуць адбіцца на ходзе палявых работ.

Ужо з першых дзён сяўбы выяўляецца рад буйнейшых недахопаў сяўбы. Напрыклад, у калгасе імя Чарвякова Камарынскага раёна сеюць нечышчаным насеннем, у калгасах «Совецкая Беларусь» і «Новая праца», гэтага-ж раёна, сеюць не правераным на ўсхожасць насеннем. Паўстае пытанне, дзе-ж райземаддзел і МТС? Куды-ж глядзяць аграномы раёна? Няўжо яны не адчуваюць, што нясуць велізарнейшую адказнасць за павышэнне ўраджайнасці?

Трэба рашучым чынам змагацца з малейшымі парушэннямі агратэхнікі. Патрэбна растлумачыць калгаснікам і калгаснікам, што поспех барацьбы за высокі ўраджай залежыць не толькі ад тэрмінаў сяўбы, але і ад таго, як будзе пасеяна, якім насеннем. Высокаякасная апрацоўка глебы, адбранае і праверанае на ўсхожасць насенне, угноенасць глебы, упчыльненыя тэрміны сяўбы — вось аб чым не трэба зараз забываць.

Зусім зразумела, што сяўба не можа быць праведзена з поспехам, дзе няма ўстойлівых брыгад, дзе брыгады не ведаюць сваіх вытворчых участкаў, дзе няма канкрэтна распрацаваных планаў сяўбы. Значыць, на правільную арганізацыю працы ў калгасах на сяўбе трэба звярнуць выключна велізарную ўвагу. Патрэбна арганізаваць у брыгадах працу так, каб ні ў аднаго калгасніка не было прагулаў, якія меліся ва многіх калгасах у мінулым годзе. Кожны калгаснік і калгасніца з вечара яшчэ павінны ведаць, дзе і што яны будуць рабіць заўтра.

У гэтай веснавой пасеўнай кампаніі па БССР ўдзельнічае яшчэ каля 12 проц. аднаасобных сялянскіх гаспадарак. Гэта не малы процант. А між тым, як зусім правільна пісала «Правда», у нашай рэспубліцы аднаасобнікі забыты. Ні раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі, ні Наркомзем не ведаюць, як падрыхтаваны аднаасобныя сялянскія гаспадаркі да сяўбы. Такое становішча нецярпіма. Сяўбу ў аднаасобным сектары трэба арганізаваць. Трэба дабіцца таго, каб усе аднаасобнікі своечасова і добраякасна засеялі выдзеленыя ім участкі зямлі, дапамагаючы ім арганізоўваць супрагу, вылучаючы зямлю для пасеву.

Некаторыя машынатрактарныя станцыі ў першыя-ж дні работы ў полі паказалі сябе дрэннымі арганізатарамі правядзення сяўбы. Напрыклад, у калгасах «Чырвоны будаўнік», «Дняпроўскі араты» і імя III Інтэрнацыянала таго-ж Камарынскага раёна, трактары працуюць з вялікімі перабоямі. Многія трактары выйшлі ў поле дрэнна адрамантаванымі, патрабуюць некаторых даробак у рамонце, патрабуюць бягучага рамонту. А дырэктар Камарынскай МТС адпусціў нават механікаў у адпачынак у такі адказнейшы перыяд.

СНК БССР і ЦК КП(б)Б указвалі дырэктарам МТС, што апошнія будуць прыцягвацца да адказнасці, калі пасля прыёму з рамонту трактары не выйдуць у поле або стануць.

Дырэктары і механікі МТС павінны быць зараз на полі ў трактарных брыгадах і не дапускаць ні малейшага прастою трактароў. Трактары павінны працаваць бесперабойна. Своечасова падвозіць гаручае ў трактарныя брыгады. Стварыць належныя культурна-бытавыя ўмовы для трактарыстаў, асабліва для трактарыстаў-стаханаўцаў.

Яшчэ раз трэба сказаць аб кіраўніцтве пасеўнай кампаніяй з боку Наркомзема БССР. Нельга далей цярпець таго, што аграномы Наркомзема сядзяць на месцы ў той час, калі ў паўднёвых раёнах рэспублікі пачынаецца масавая сяўба, у астатніх раёнах наступіў рашаючы момант падрыхтоўкі сяўбы. Такое кіраўніцтва, такая дапамога калгасам нікуды не варта. Гэта цвёрда павінны запамятаць кіраўнікі Наркомзема і ў першую чаргу тав. Бенек.

Веснавая сяўба ў паўднёвых раёнах пачалася, патрэбна толькі яе разгарнуць шырэй, каб яна прыняла масавы характар. У бліжэйшыя дні распачнецца сяўба ў цэнтральных і паўночных раёнах нашай рэспублікі. Раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі павінны памятаць, што поспех барацьбы за высокі ўраджай залежыць іменна ад таго, як яны арганізуюць сяўбу. Быстрае выпраўленне недахопаў, адзначаных стаханаўцамі на злёце, жывое аператыўнае кіраўніцтва калгасамі, практычная дапамога ім, самая цесная сувязь з калгасным актывам, з стаханаўцамі сельскай гаспадаркі — вось што зараз патрабуецца ад кіраўнікоў раёнаў.

Усе акруговыя і раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі павінны памятаць указанне Цэнтральнага камітэта КП(б)Б і Саўнаркома БССР аб тым, што падрыхтоўка і правядзенне веснавой пасеўнай кампаніі з'яўляецца зараз важнейшай работай у жыцці нашай рэспублікі.

Аб абавязковых пастаўках бульбы дзяржаве ў 1937 годзе калгасамі, калгаснікамі і аднаасобнымі гаспадаркамі

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б

У адпаведнасці з пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 20-III—37 г. «аб абавязковых пастаўках зярна, рысу, сланечніка і бульбы дзяржаве ў 1937 г. калгасамі, калгаснікамі і аднаасобнымі гаспадаркамі і аб стаўках натурылаты работ МТС», пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 20/III—1937 года № 465 «аб памяншэнні некаторым раёнам нормы здачы зярна і бульбы калгасамі, калгаснікамі і аднаасобнікамі па БССР, Калінінскай, Ленінградскай, Вінніцкай і Кіеўскай абласцях» і загадамі Камзага ад 21 сакавіка 1937 года № 481 і ад 28/III—37 г. Совет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б—пастанаўляюць:

1. Захаваць па абавязковых пастаўках на 1937 год дзейнічаўшыя ў 1936 годзе парадак, тэрміны і пераўтворныя нормы здачы бульбы дзяржаве калгасамі, абслугоўваемымі МТС, калгасамі, неабслугоўваемымі МТС, калгаснікамі і аднаасобнымі гаспадаркамі, за выключэннем 29 раёнаў, якім устанавіць наступныя нормы здачы бульбы дзяржаве:

(у цэнт. з га).

№№ п.-п.	НАЗВА РАЁНАЎ.	Калгасам МТС	Калгасам не МТС	Калгаснікі	Аднаасобн. гаспадаркі.
1.	Асвейскі	4	5	7	14
2.	Бягомльскі	3	4	6	11
3.	Уядзенскі	6	7,5	9,5	17
4.	Ветрынскі	6	7	9	16
5.	Грэскі	7	8,5	11,5	20
6.	Дрысенскі	4,5	5,5	8	15
7.	Дзержынскі	7,5	8,5	10,5	18
8.	Даманавіцкі	6	7	9	16
9.	Ельскі	3	4	6	11
10.	Жыткавіцкі	3	4	6	11
11.	Заслаўскі	6	7,5	9,5	18
12.	Копыльскі	8	9,5	12,5	20
13.	Капаткевіцкі	6	7,5	10,5	18
14.	Лагойскі	5,5	6,5	9	17
15.	Лельчыцкі	3	4	6	11
16.	Лепельскі	4,5	6	8	15
17.	Любаньскі	7	8	11	20
18.	Мозырскі	6	7	9	16
19.	Нараўлянскі	3	4	6	11
20.	Петрыкаўскі	4	5,5	8,5	16
21.	Плешчаніцкі	4	5,5	8,5	14
22.	Полацкі	5,5	7	9,5	16
23.	Расонскі	4,5	5,5	7,5	15
24.	Слуцкі	8	9,5	12,5	20
25.	Старобінскі	7	8,5	10,5	18
26.	Тураўскі	3	4	6	11
27.	Ушацкі	4	5	6,5	12
28.	Чашніцкі	6	7,5	9,5	17
29.	Чырвонаармейскі	6	7,5	9,5	18

Астатнім раёнам БССР пакінуць наступныя існаваўшыя ў 1936 годзе параённыя нормы здачы бульбы дзяржаве:

(у цэнт. з га).

№№ п.-п.	НАЗВА РАЁНАЎ	Калгасам МТС	Калгасам не МТС.	Калгаснікі	Аднаасобн. гаспадаркі.
1.	Аршанскі	11	12,5	15	22
2.	Асіпавіцкі	11	12	14	21
3.	Бабруйскі	13	14,5	17,5	23
4.	Багушэўскі	10	11	13	20
5.	Барысаўскі	10	11	13,5	20
6.	Бешанковіцкі	7	8	10	17
7.	Брагінскі	12	13,5	16,5	23
8.	Б. Кашалеўскі	10,5	11,5	13,5	21
9.	Быхаўскі	10,5	12	14	21
10.	Бялыніцкі	9,5	10,5	13,5	21
11.	Бярэзінскі	9	10,5	12,5	20
12.	Веткаўскі	10	11,5	13,5	21
13.	Віцебскі	10	11,5	14,5	21
14.	Гарадоцкі	8,5	10	12	18
15.	Глускі	9	10,5	13	20
16.	Гомельскі	11	12	14	21
17.	Горацкі	9	10,5	13	19
18.	Журавіцкі	10	11,5	13	20
19.	Дубровенскі	8	9	11	17
20.	Дрыбінскі	9	10,5	13	19
21.	Добрушскі	11	12	14	21
22.	Жлобінскі	11	12	14	22
23.	Камарынскі	10	11,5	13,5	21
24.	Кармянскі	10	11	13,5	20
25.	Касцюковіцкі	8,5	10	13	19
26.	Клімавіцкі	8,5	10	13	19
27.	Клічаўскі	10	11	13	20
28.	Круглянскі	10	11,5	13,5	20
29.	Крупскі	8	9	11	18
30.	Кіраўскі	12	13,5	15,5	22
31.	Крычаўскі	9,5	10,5	12,5	19
32.	Лоеўскі	8	9,5	11,5	18
33.	Лёзнянскі	7	8,5	11	17
34.	Магілеўскі	12,5	13,5	16	23
35.	Менскі	13,5	15	17	23
36.	Мехаўскі	8,5	10	12	18
37.	Мсціслаўскі	8,5	10	12,5	19
38.	Парыцкі	10	11	13	20
39.	Прапойскі	9,5	11	13	19
40.	Пухавіцкі	10	11	13,5	20
41.	Рагачоўскі	13	14	16	23
42.	Рэчыцкі	10,5	11,5	13,5	21
43.	Сыжаўскі	11	12	14,5	21
44.	Сенненскі	9	10,5	12,5	18
45.	Сіроцінскі	7,5	9	11	17
46.	Смалявіцкі	10,5	12	15	21
47.	Ст. Дарожскі	10,5	11,5	13,5	21
48.	Свяцілавіцкі	10	11,5	13,5	21
49.	Суражскі	8	9	11	18
50.	Талочынскі	10	11,5	13,5	20
51.	Уваравіцкі	12	13	16	22
52.	Хоцімскі	8,5	10	13	19
53.	Хойніцкі	12	13	15	21
54.	Халопеніцкі	8	9	11	18
55.	Церахоўскі	10	11,5	13,5	20
56.	Чавускі	10	11,5	13,5	20
57.	Чачэрскі	10	11,5	13,5	20
58.	Чырвонапольскі	8	9,5	11,5	18
59.	Чэрвеньскі	10	10,5	13,5	21
60.	Чэрыкаўскі	9	10,5	12,5	20
61.	Шклоўскі	9,5	10,5	12,5	21

2. У РАЁНАХ

1. Барысаўскім, 2. Бешанковіцкім, 3. Брагінскім, 4. Быхаўскім, 5. Бягомльскім, 6. Бялыніцкім, 7. Бярэзінскім, 8. Глускім, 9. Дубровенскім 10. Дзержынскім, 11. Даманавіцкім, 12. Ельскім, 13. Журавіцкім, 14. Камарынскім, 15. Касцюковіцкім, 16. Клімавіцкім, 17. Крупскім, 18. Кіраўскім, 19. Лагойскім, 20. Лепельскім, 21. Лоеўскім, 22. Любаньскім, 23. Лёзнянскім, 24. Менскім, 25. Мехаўскім, 26. Нараўлянскім, 27. Плешчаніцкім, 28. Полацкім, 29. Рагачоўскім, 30. Рэчыцкім, 31. Старобінскім, 32. Уваравіцкім, 33. Хойніцкім, 34. Церахоўскім, 35. Чачэрскім, 36. Чэрвеньскім, 37. Чырвонапольскім, 38. Шклоўскім

пакінуць на 1937 год існаваўшыя ў 1936 годзе тыя-ж дзве нормы здачы бульбы дзяржаве ў тых-жа сельскіх советах, за выключэннем Бягомльскага, Дзержынскага, Ельскага, Даманавіцкага, Лагойскага, Лепельскага, Любаньскага, Нараўлянскага, Полацкага, Старобінскага і Плешчаніцкага раёнаў. у якіх дыферэнцыраваныя нормы па асобных сельсоветах зніжаюцца ў сувязі са зніжэннем норм па раёну.

Даручыць Упаўкамзаг СНК СССР па БССР устанавіць паказаным раёнам дыферэнцыраваныя нормы здачы бульбы дзяржаве па асобных сельскіх советах гэтых раёнаў.

Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б В. ШАРАНГОВІЧ.
1 красавіка 1937 г. гор. Менск.

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ПАСЕЎНАЙ! ШЫРЭЙ РАЗГАРНУЦЬ СЯЎБУ Ў ПАЎДНЁВЫХ РАЁНАХ!

У КІРАЎСКУ НЯМА ТРЫВОГІ ЗА СЯЎБУ

Большасць калгасаў Кіраўскага раёна, якія па кліматычных і глебавых умовах ужо могуць разгарнуць палявыя работы, усё яшчэ рыхтуюцца да веснавой сяўбы.

Узяць хаця-б адзін з буйнейшых калгасаў у раёне — калгас імя III з'езда Совецтаў Казуліцкага сельсовета (старшыня калгаса Салановіч), які мае план яравой сяўбы 865 гектараў. Тут далёка не поўнасцю яшчэ засыпан насенны фонд. Насенне канюшыны адсутнічае. Адсутнічае насенне ільну, вікі і іншых культур. Да вывазкі торфу і гною яшчэ не прыступілі. Не прыступілі да завозу мінеральнага ўгнаення, якога патрэбна завезці 12 тон. Рамонт сельскагаспадарчага інвентару не закончан, а да рамонту калёс нават і не прыступалі.

Гэта так у буйнейшым калгасе. У астатніх-жа калгасах, на якія раённыя арганізацыі менш звяртаюць увагі, яшчэ горш абстаіць справа. Па калгасах загатоўка і вывазка ўгнаенняў сарвана. Так, па раёну з патрэбных вывезці на поле 90 тысяч тон торфу вывезена толькі 26,081 тоны, а гною—і таго менш. З патрэбных вывезці 299.290 вазоў вывезена толькі 27.380 вазоў — 9 проц. плана.

Раённы план збору попелу выкаран на 21 проц., а памёту — на 13 проц. Мінеральнае ўгнаенне амаль усё ляжыць яшчэ на станцыі Бярэзіна. Так, на 28 сакавіка знаходзілася на станцыі нявывезеных 309 тон мінеральных угнаенняў.

Аб падрыхтоўцы насення да сяўбы яскрава сведчыць той факт, што многія калгасы, асабліва калгасы Грыбавецкага і Капусцінскага сельсоветаў, да гэтага часу яшчэ не зрабілі ні адной праверкі на ўсхожасць насення праз насенна-кантрольную лабараторыю. Міжкалгасны абмен насення выканан толькі на 13 проц. У большасці калгасаў (імя Будзённага, імя Шміта, імя Лекерта і інш.) насенне да гэтага часу нават не ачышчана.

З рамонтам інвентару таксама дрэнна абстаіць справа. У калгасе «Пяцігодка» Старцаўскага сельсовета пры выездзе ў поле не знайшлося ні аднаго спраўнага плуга.

Што-ж рабілі і робяць раённыя арганізацыі? Нельга сказаць, што ў райкоме КП(б)Б, у райвыканкоме і райземаддзеле людзі сядзелі і сядзяць без работы. За зіму напісана не адзін дзесятак адозваў і пастаноў. Праўда, гэтыя адозвы і пастановы не прынеслі ніякай карысці. 22 сакавіка райвыканком напісаў новую пастанову, у якой гаворыцца: «Абавязаць загадчыка райза тав. Дамброўскага выявіць усе такі прычыны зрыву падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, выклікаўшы ў раён старшынь адстаючых калгасаў».

Бачыце якое кіраўніцтва калгасамі! Вось чаму не выпадкова, што ў калгасах нікому не ўбачыш ні аднаго раённага работніка.

Выкліканне старшынь адстаючых калгасаў у раён для выяўлення розных прычын ўвайшло ў практыку работы райвыканкома. Старшыня РВК тав. Касцюк і загадчык райземаддзела тав. Дамброўскі пачалі нават праводзіць пасяджэнні праўленняў калгасаў у сваіх габінетах. Так, у габінеце Касцюка былі праведзены пасяджэнні праўленняў адстаючых калгасаў імя Карла Маркса Старцаўскага сельсовета, «Пяцігодка» гэтага-ж сельсовета і інш.

Адсутнасць канкрэтнага кіраўніцтва калгасамі, адарванасць раённых кіраўнікоў ад мас прывялі да таго, што калгасы раёна веснавую сяўбу сустрэлі з вялікім прарывам. Нават пасля апошняй пастановы ЦК КП(б)Б і Саўнаркома БССР аб ходзе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, пасля рашучага папярэджання з боку ЦК і Саўнаркома аб неабходнасці ўзмацнення работы для ліквідацыі прарыву ў падрыхтоўцы да выезду ў поле кіраўніцтва Кіраўскага раёна (старшыня РВК тав. Касцюк, сакратар райкома КП(б)Б тав. Вільчак) не зрабіла для сябе адпаведных вывадаў. Наранейшаму ў Кіраўску пануе самазаспакоенасць, няма трывогі за сяўбу, спадзяваюцца на самацёк.

М. ЯРЧАК.

МАГІЛЕЎШЧЫНА НАПЯРЭДАДНІ СЯЎБЫ

Наступіўшае пацяпленне выклікала вялікае ажыўленне ў заканчэнні ўсіх падрыхтоўчых работ да выхаду ў поле. Асобныя калгасы Хонаўскага, Дашкаўскага, Гарадзішчанскага, Гаранскага і іншых сельсоветаў пачалі палявыя работы.

Упершыню ўсе калгасы раёна будуць сёлета абслугоўвацца машынатрактарнымі станцыямі, якія да выхаду ў поле гатовы. Здзіўляе толькі бясклопатнасць, якую праяўляе Вендрыжская МТС да заключэння дагавораў з калгасамі. На 26 сакавіка з 57 калгасаў дагавары заключаны толькі з 18 калгасамі.

Дырэктар МТС тав. Старасотнікаў не знайшоў іншага адказу, як усю віну зваліць на райком партыі, што заключэнне дагавораў зрываецца толькі таму, што райком партыі выклікаў парторга МТС на курсы. Зараз МТС заключэнне дагавораў з калгасамі мяркуе расцягнуць на 15—20 дзён.

Вялікую работу па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы правялі Магілеўская МТС (дырэктар тав. Ванчук) і Лупалаўская (дырэктар тав. Удоўскі).

Агульныя сходы калгаснікаў, на якіх зацвярджаюцца дагаворы, праходзяць пад знакам арганізаванай праверкі гатоўнасці калгасаў да палявых работ і сяўбы, ліквідацыі раду недахопаў, якія яшчэ ёсць у рабоце.

Праводзячы агульныя сходы калгаснікаў, як правіла, уключаюць у дагаворы не толькі планавыя заданні для работы МТС, а значна павялічваюць іх, патрабуючы высокай якасці работ трактарных брыгад.

Дм. ВЫННІКАЎ.

ДАЛЕЙ ПАСТАНОЎ НЕ ПАЙШЛІ

КАСЦЮКОВІЧЫ. Толькі 10 лютага ў раёне стала вядома, што з падрыхтоўкай каня да сяўбы пагражаючае становішча. Каб застрахаваць сябе ад усякіх «непрыемнасцей», на бюро райкома і прэзідыуме райвыканкома вынеслі пастанову: «Прыняць неадкладныя і рашучыя меры па адпаўленню і захаванню конскага пагалоўя». Больш канкрэтных мер падрыхтоўкі каня да сяўбы ў раёне не знайшлі.

Паўнейшая абязлічка, цякучасць кадраў прывялі да таго, што ў калгасе «Зара» Селічоўскага сельсовета двое коней загналі ў пустое гумно і пакінулі іх без ніякага нагляду. Калгас знаходзіцца каля самага сельсовета, але старшыня Мельнікаў не прыняў ніякіх мер. У калгасе «Наша праца» Хоцімскага сельсовета абавязкі конюха выконваюць усе калгаснікі па чарзе.

За варварскае знішчэнне конскага пагалоўя пакуль што ніхто не прыцягнут да адказнасці. Старшыня РВК тав. Грэбенчык усё гэта лічыць нармальным з'явішчам. Ён гаворыць:

— Без згоды пракуратуры рэспублікі нельга прыцягваць да судовай адказнасці кіраўнікоў калгасаў.

Ці прыняў райвыканком якія-небудзь канкрэтныя меры, каб захаваць конскае пагалоўе і вывесці яго на палявыя работы працаздольным? Прыняў, 17 сакавіка, роўна праз 5 тыдняў, прэзідыум райвыканкома ў сваёй пастанове адзначыў пагражаючае становішча і даручыў Грэбенчыку і загадчыку райза Паршыну скласці пастанову. На гэтым покуль што клопаты аб кані ў раёне спынены.

ПЕТРАВІЦКІ.

ПАМЫЛКІ ПЕРШЫХ ДЗЁН СЯЎБЫ

КАМАРЫН, 1 красавіка (БЕЛТА). Увесь апошні час у раёне выключна цёпла. Днём тэмпература даходзіла да 18 градусаў цяпла. Зазеляненні азімыя, хутка расце трава.

У раёне палявыя работы ў разгары. Пад яравыя падрыхтавана 1.800 гектараў глебы. Праз некалькі дзён калгасы ўступяць у паласу масавай сяўбы. Брыгада Хірэнкі Аксінні з украінскага калгаса «Рухавік рэволюцыі» закончыла сяўбу ячменю і аўса на плошчы 16 гектараў. Сяўба праведзена радковымі сеялкамі на добра апрацаванай і ўгноенай глебе. Засеяны ўчастак прынят па акту старшынёй калгаса.

Добра ідзе сяўба ў калгасах Баршчоўскага і Іолчанскага сельсоветаў, дзе ўжо засеяна 85 гектараў. Калгасы гэтых сельсоветаў для ўгнаення поля падрыхтавалі 56 тыс. тон торфу замест 30 тыс. тон па плану.

Аднак першыя дні палявых работ паказваюць, што ў раёне да сяўбы як належыць не падрыхтаваліся. З 46 сеялак спраўных усяго 38. У 16 калгасах не праведзена другая апрабацыя насення. Калгасы «Совецкая Беларусь» і «Новая праца» зусім не прадставілі для аналізу насення.

Ёсць выпадкі парушэння элементарных правілаў агратэхнікі. Неачышчаным насеннем сее калгас імя Чарвякова. У калгасах «Чырвоны будаўнік», «Дняпроўскі араты» і «III Інтэрнацыянал» з перабоямі працуюць трактры, бо да месца работы не падвезена гаручае і змазачнае. Ёсць выпадкі прастойвання трактароў з-за дробных паломак. Трактароў на-ходу рамантаваць няма каму, бо МТС усіх механікаў адпусціла ў адпачынак. Трэба адзначыць, што РВК палявымі работамі па-сапраўднаму не кіруе.

Тэлеграма з Бруселя

Таварышам СТАЛІНУ, МОЛАТАВУ, старшыні Ўсесаюзнага камітэта па справах мастацтваў КЕРЖЭНЦЭВУ

Рапартуем партыі і ўраду: совецкія скрыпачы, пасланыя на міжнародны конкурс скрыпачоў імя Ізаі ў Бруселі, атрымалі: Давід Ойстрах — першую прэмію, Ліза Гілельс — трэцюю, Буся Гольдштэйн — чацвертую, Марына Казалупава — пятую, Міша Фіхтэнгольц — шостую.

Гэта перамога совецкай скрыпічнай школы, паследаўшая ўслед за перамогай на варшаўскім конкурсе піяністаў, з'яўляецца яркім праяўленнем росквіту музыкальнай культуры нашай краіны.

Гэты поспех, якім мы абавязаны клопатам і любві совецкага ўрада, натхняе нас на далейшую работу над сабой, на барацьбу за новыя дасягненні совецкага мастацтва.

Ямпольскі, Ойстрах, Гілельс, Гольдштэйн, Казалупава, Фіхтэнгольц, Дзякаў.

ТРЫУМФ СОВЕЦКАГА МАСТАЦТВА

БРУСЕЛЬ (сталіца Бельгіі). 2 красавіка. (БЕЛТА). Учарашні вечар бельгійская сталіца правяла ў значнай меры пад уражаннем вынікаў міжнароднага конкурса скрыпачоў.

У паўпредства СССР у Бельгіі паступаюць шматлікія прывітальныя тэлеграмы ў сувязі з трыумфам совецкіх скрыпачоў. Брусельскі друк шырока публікуе рэзультаты конкурса, адзначаючы перамогу совецкага мастацтва. Газета «Дэрньер эр» вышла сёння з велізарным партрэтам Давіда Ойстраха на першай старонцы.

ПІСЬМО ЗНАТНАГА СПЛАЎШЧЫКА БССР тав. ТУФАРА

ДА ЎСІХ СТАХАНАЎЦАЎ, РАБОЧЫХ І ІНЖЫНЕРНА-ТЭХНІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ СПЛАВА БЕЛАРУСІ

Дарагія таварышы!

На рэках Беларусі пачаўся сплаў. Тысячная армія сплаўшчыкаў уступіла ў бой за своечасовую дастаўку лесаматэрыялаў фабрыкам і заводам, за безаварыйны сплаў, за ўдарную работу, дастойную нашай ордэнаноснай рэспублікі.

Армія сплаўшчыкаў Беларусі вылучыла ў сезон 1936 года дзесяткі таленавітых арганізатараў мас, знатных стаханаўцаў, узорная работа якіх была адзначана ўрадам.

1936 стаханаўскі год для маёй брыгады быў годам замацавання дасягнутых перамог. Сплаўныя работы я скончыў на 40 дзён раней тэрміну, выканаўшы сезоннае заданне на 136 проц.

З самага пачатку новага сезона я разам са сваёй брыгадай рашыў пачаць соцыялістычнае спаборніцтва паміж сплаўшчыкамі ордэнаноснай Беларусі за высокія ўзоры работы, за безаварыйны сплаў, за датэрміновае выкананне плана.

Мая брыгада ў гэтым годзе павінна сплавіць 40 тысяч кубаметраў лесаматэрыялу. Да выканання гэтай адказнейшай задачы брыгада гатова. Зімнюю сплотку мы скончылі 15 сакавіка. Мы поўнасцю выкарыстаем вялікую веснавую ваду для датэрміновага выканання плана.

Я выклікаю на соцыялістычнае спаборніцтва ўсіх стаханаўцаў і рабочых сплава БССР.

Я заклікаю ўсіх сплаўшчыкаў рэспублікі ўключыцца ў новае стаханаўскае наступленне.

Сплаўшчык Беларусі ТУФАР.

Аб выніках правядзення справаздачна-выбарчага схода партарганізацыі Наркомзема БССР

Пастанова бюро Кагановіцкага горкома КП(б)Б

Заслухаўшы паведамленне прадстаўніка РК КП(б)Б т. Рохкіна, бюро РК КП(б)Б канстатуе, што справаздача, зробленая на справаздачна-выбарчым сходзе сакратаром парткома т. Журавым, не адлюстроўвала асноўных задач, пастаўленых Пленумам ЦК ВКП(б), і сапраўднага становішча спраў партарганізацыі Наркомзема.

Справаздачна-выбарчы сход партарганізацыі Наркомзема праходзіў на нізкім палітычным узроўні, без належнай крытыкі і самакрытыкі буйнейшых недахопаў у партарганізацыі Наркомзема, у выніку чаго не былі ўскрыты меўшыя месца ў Наркомземе факты засмечанасці класава варожымі элементамі, факты шкодніцкіх спраў, факты падхалімства, сямейственасці і заціску самакрытыкі.

Выходзячы з гэтага, бюро РК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Адмяніць праведзены справаздачна-выбарчы сход партарганізацыі Наркомзема.

2. Склікаць паўторны партыйны сход, на якім паручыць тав. Рохкіну выступіць з растлумачэннем гэтага рашэння. Правесці справаздачу парткома і выбары, разгарнуўшы сапраўдна-большэвіцкую крытыку і самакрытыку не гледзячы на асобы.

3. Бюро РК КП(б)Б звяртае ўвагу партарганізацыі Наркомзема БССР на неабходнасць ускрыць да канца дапушчаныя буйнейшыя палітычныя промахі, якія далі магчымасць чужым элементам пралезці ў апарат Наркомзема і праводзіць сваю подлую шкодніцкую работу.

4. Склікаць спецыяльную нараду сакратароў парткомаў совецкіх устаноў, на якой абмеркаваць рашэнне бюро РК КП(б)Б па гэтаму пытанню.

Сакратар Кагановіцкага горкома КП(б)Б ВАРОНЧАНКА.

Назначэнні тт. Лаганоўскага і Кандэлакі

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР пастанавіў зацвердзіць тав. Лаганоўскага Мечыслава Антонавіча намеснікам народнага камісара харчовай прамысловасці СССР, а тав. Кандэлакі Давіда Владзіміравіча намеснікам народнага камісара замежнага гандлю.

СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРЧЫЯ СХОДЫ ПЯРВІЧНЫХ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

КАЛІ-Ж У ГОРЖЫЛСАЮЗЕ ПЕРАМОГУЦЬ БЕСКЛАПОТНАСЦЬ?

29 сакавіка пачаўся выбарчы сход партыйнай арганізацыі Менгоржылсаюза. Сход быў назначан на 7 гадзін увечары, але пачаўся з прычыны несвоечасовай яўкі ў 7 гадзін 40 мінут. Са спазненнем з'явіліся комуністы Белагурава, Герасімовіч і Голуб.

Справаздачны даклад сакратара парткома т. Даргес цягнуўся паўтары гадзіны. Аднак, дакладчык не знайшла часу, каб сказаць аб фактах аслаблення пільнасці ў арганізацыі. Агульныя словы аб недахопах, замоўчванне падхалімства і работы ворагаў у горжылсаюзе не садзейнічалі разгортванню самакрытыкі.

У ходзе спрэчак крытыка разгарнулася недастаткова. Асобныя комуністы не зразумелі сутнасці рашэння Пленума ЦК ВКП(б) і таму іх выступленні былі бязазубымі і неканкрэтнымі. Так выступілі тт. Мірына, Герасімовіч і член парткома Бруднер. Аб дрэнным рабоце парткома і дрэнным кіраўніцтве горжылсаюза гаварылі ў спрэчках комуністы Гальперын, Махліна, Камінскі і Зільберман.

Тав. Гальперын спыняецца на фактах парушэння статута партыі і партыйнай дэмакратыі, што прывяло да прытуплення пільнасці. Невыпадкова таму,—гаворыць т. Гальперын,—што каптаваны ў склад парткома Астроўскі аказаўся класавым ворагам, а прайдзісвет Мураўаў, якому дастаткова было ашукаць нас прад'яўленнем вокладкі партыйнага білета, як партком і адміністрацыя горжылсаюза папулярызавалі гэтага прайдзісвета, як лепшага работніка. Заядлы трацкіст Зісман быў высунут намеснікам старшыні горжылсаюза і гэта зроблена тады, калі ўжо была высветлена яго бяздзейнасць на рабоце старшыні жакта. Гэты класавы вораг быў каптаван у склад парткома і высунут прапагандыстам. Член партыі Махліна крытыкуе работу райкома, прадстаўнікі якога ад часу да часу бывалі ў партыйнай арганізацыі горжылсаюза, але нічым не дапамагалі.

Тав. Зільберман, — старшыня жакта № 1,—гаворыць аб бюракратычных адносінах да членаў партыі з боку сакратара парткома Даргес і наяўнасці фактаў сямейственасці і падхалімства. Ён гаворыць аб дрэнным кіраўніцтве жылсекцыяй горсовета. Аднаго разу горсовет рашыў заслухаць мяне, як старшыню жакта, і не папярэдзіў мяне аб гэтым, а завочна вынес суровую вымову. Я прыйшоў у партком, каб высветліць гэту справу, але Даргес пачала пагражаць выключэннем мяне з партыі.

Кагановіцкі райком павінен умяшацца ў ход спрэчак, завастрыць увагу партарганізацыі на аслабленні ў ёй пільнасці. Нельга дазваляць балбатунам і некаторым не ў меру робкім комуністам агульнымі прамовамі трымаць і надалей партарганізацыю ў становішчы бестурботнасці.

БРУДНЕР.

ПАЛІТЫЧНАЯ ПАМЫЛКА ІНСТРУКТАРА ГАРКОМА

На справаздачна-выбарчым сходзе партыйнай арганізацыі віцебскай іголкавай фабрыкі, комуністы, крытыкуючы недахопы ў рабоце парткома, адначасова абвінавачвалі дырэктара завода т. Шумкова ў зазнайстве, грубасці і заціску самакрытыкі. Тав. Лукіна, напрыклад, прывяла такі прыклад:

— Аднаго разу,—гаворыць яна,—я ў прысутнасці т. Шумкова выказала думку, што мы дрэнна падрыхтаваліся да стахановскай дэкады. Тут-жа т. Шумкоў мяне за гэта, з уласцівай яму грубасцю, вылаяў. Я-ж абвінаваціла Шумкова ў тым, што ён адарваўся ад мас. Каб папасці да яго на прыём, трэба літаральна чакаць гадзінамі. Работніца тав. Лізер на чаканне прыёму ў дырэктара патраціла некалькі дзён.

Падобных фактаў прыводзілася на сходзе многа. У віцебскай партыйнай арганізацыі і ў сябе на заводзе тав. Шумкоў праславіўся, як грубы зажымшчык крытыкі і самакрытыкі. Паводзіны тав. Шумкова на даным сходзе яшчэ раз пацвердзілі, што і пасля рашэння Пленума ЦК ВКП(б) ён прадаўжае цвёрда прытрымлівацца сваёй старой тактыкі—заціску самакрытыкі. Амаль кожнага, хто адважваўся ўказваць на яго недахопы, Шумкоў тут-жа яго перарываў: «Няправільна, хлусіш» і т. д., і т. п. А пасля ў сваім асабістым выступленні ён проста «адчытаў», хто выступаў супроць яго.

Нельга таксама прайсці міма паводзін прысутнічаўшага на сходзе інструктара гаркома партыі тав. Матвеева. Калі тав. Вінакураў пачаў гаварыць аб Бухарыне і Рыкаве, выказваючы сваё асабістае ўхваленне з повалу рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) аб выключэнні з партыі гэтых ворагаў рабочага класа, тав. Матвееў чамусьці палічыў патрэбным ў сярэдзіне слова яго перадыніць.

— Гэта,—гаворыць тав. Матвееў,—мы ведаем. Ты нам лепш раскажы аб рабоце парткома. Тав. Матвееў у даным выпадку зрабіў грубую палітычную памылку, перапыніўшы таварыша, які праявільна мабілізаваў партыйную арганізацыю на барацьбу з правымі адшчапенцамі.

Работа парткома прызнана нездавальняючай. У склад парткома было высунута 12 кандыдатур. Пасля іх дакладнага абмеркавання ў спісе было пакінута 5 таварышоў. Кандыдатуру дырэктара завода тав. Шумкова, члена парткома мінулага складу ў новы склад парткома, як і трэба было чакаць, ніхто не высунуў. У новы склад парткома тайным галасаваннем абралі трох таварышоў: стахановца завода Раманоўскага, майстра завода тав. Цільвекса і былога сакратара парткома тав. Шэпіра.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

Рабочыя першага цэха першай змены менскай швейнай фабрыкі «Кастрычнік» за чыткай даклада тав. Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б).

Фото Я. Салавейчыка.

Аб выніках Пленума ЦК ВКП(б)

З РЭЗАЛЮЦЫІ СХОДА АКТЫВА ГОМЕЛЬСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ПА ДАКЛАДУ ТАВ. ГАЛАДЗЕДА, ПРЫНЯТАЙ 26 САКАВІКА 1937 ГОДА

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад тав. Галадзеда аб выніках Пленума ЦК ВКП(б), сход актыва гомельскай партарганізацыі поўнасцю ўхваляе рашэнні Пленума ЦК ВКП(б) і патрабуе ад усіх пярвічных партарганізацый, партыйных кіраўнікоў і ад кожнага комуніста няўхільнага правядзення іх у жыццё.

Сход актыва лічыць, што ўсе недахопы партыйнай работы, ускрытыя і асужданыя Пленумам ЦК, поўнасцю былі і ёсць у рабоце гомельскай партарганізацыі і ў рабоце Гомельскага гаркома КП(б)Б.

Партыйныя камітэты, парторгі пярвічных партарганізацый і ў першую чаргу гарком партыі, захапляючыся гаспадарчай работай, падмянялі гаспадарчыя органы, закінулі партыйна-палітычную работу і работу па выхаванню комуністаў, перадаверылі яе другарадным работнікам.

Большэвіцкая крытыка і самакрытыка, якія з'яўляюцца ў руках партыі сродкам прасоўвання наперад, магутнай зброяй барацьбы за выхаванне кадраў, выпраўлення ўсіх памылак і прарываў работы ў гомельскай партарганізацыі разгорнуты зусім недастаткова, а ў некаторых звеннях пануе прамы заціск самакрытыкі.

Важнейшы прынцып арганізацыйнага будаўніцтва нашай партыі—дэмакратычны цэнтралізм—у гомельскай партарганізацыі быў падменен небольшэвіцкай практыкай каптацыі і прамым назначэнствам. Бюракратычным цэнтралізмам склах гарадскога камітэта партыі аказаўся амаль увесь каптаваным. З 52 членаў гаркома каптаваных — 40. Многія партыйныя камітэты і парторгі ў пярвічных партарганізацыях не абіраліся на працягу трох год, у абсалютнай большасці пярвічных партарганізацый сакратары парткомаў, парторгі змяняліся па 3—4 разы. Назначэнства прыкрывалася практыкай даабрання.

Бескантрольнасць работы гаркома, парткомаў, палітаддзелаў чыгуначнага вузла і Дняпра-Дзвінскага рачнога параходства, зусім недастатковае разгортванне крытыкі і самакрытыкі, нячулыя адносіны да сігналаў стварылі атмасферу самасупакоенасці, дабрадушнасці, угодніцтва, падхалімства і чынапачытання.

Сход актыва адзначае зусім нездавальняючую пастаноўку прапаганды марксізма-ленінізма, палітычнай агітацыі, нездавальняючае кіраўніцтва з боку гаркома, парткомаў нізавым друкам. Не вядзецца работа з рабселькорамі. Няма неабходнай дапамогі газетным работнікам і нізавому друку. Гарком за апошні год не правёў ні адной нарады газетных работнікаў.

Сход актыва адзначае недапушчальную запушчанасць партыйнай работы на сяле, слабую работу пярвічных партарганізацый сяла і запушчанасць палітычнай работы ў сельсоветах і калгасах. Толькі ў рэзультаце адсутнасці партыйна-палітычнай работы і адарванасці кіраўнікоў ад мас дапушчана скажэнне лініі партыі ў адносінах да аднаасобнікаў, незаконная канфіскацыя маемасці ў аднаасобных гаспадарках, якая мела месца ва Урыцкім сельсавеце. Усё гэта гаворыць, што рашэнні ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б па Лепельскаму раёну палкам адносяцца і да гомельскай партыйнай арганізацыі.

Сход партактыва лічыць, што ЦК КП(б)Б, захапіўшыся гаспадарчай работай, таксама пакінуў на самацёк партыйна-палітычную і выхаваўчую работу ў горадзе, роля горада, як асноўнай базы партыйна-палітычнай работы, была прыніжана. Разам з тым сход актыва адзначае недастатковую ўвагу пярвічным партыйным арганізацыям з боку ЦК КП(б)Б. Работнікі раду аддзелаў ЦК — сельскагаспадарчага, школьнага — займаюцца толькі гаспадарчымі пытаннямі, не звяртаюць увагі на партыйную работу. Зусім адсутнічае кіраўніцтва з боку аддзелаў друку, культуры, прапаганды і агітацыі. Многія з загадчыкаў аддзелаў рэдка бываюць на месцах — у раёнах.

Выбары партыйных органаў на аснове закрытага (тайнага) галасавання павінны быць праведзены пад знакам большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі, ліквідацыі ўсіх недахопаў у партыйнай рабоце, мабілізацыі пільнасці комуністаў і іх актыўнасці. Такое правядзенне выбараў уздыме адказнасць кожнага кіраўніка перад партыйнымі масамі, ударыць па элементах сямейственасці, угодніцтва і падхалімства і будзе садзейнічаць вылучэнню здольных, лепшых, адданых партыі і яе Цэнтральнаму Камітэту большэвікоў.

***

Сход актыва цалкам і поўнасцю ўхваляе рашэнне Пленума ЦК ВКП(б) аб выключэнні Бухарына і Рыкава з радоў ВКП(б), як яўных ворагаў рабочага класа, за іх антыпартыйную адрадніцкую контрэволюцыйную дзейнасць, накіраваную на знішчэнне социялістычных завадзёў рабочых і сялян і на аднаўленне капіталізма ў нашай краіне.

АБ СПРАВАХ НАРКОМАСВЕТАЎСКІХ І ШКОЛЬНЫХ

Хэй спрэчак на справаздачна-выбарчым сходзе партарганізацыі палітасветшколы ўскрывае бюракратычныя метады кіраўніцтва гэтай школай з боку аддзела палітасветработы ЦК КП(б)Б (заг. т. Ткачэвіч) і Наркомасветы (нарком Дзякаў).

За апошнія 6 месяцаў сістэма падрыхтоўкі палітасветработнікаў ужо тры разы зменьвалася. Так на базе магілеўскага палітасветінстытута і магілеўскай соўпартшколы была арганізавана трохгадовая школа ў Менску і аднагадовая ў Магілеве. Было праведзена камплектаванне студэнтамі, распачаліся заняткі і раптам зноў у снежні 1936 г. нечаканая рэарганізацыя. Студэнтаў двух школ распускаюць, школы ліквідуюцца і ствараецца новая двухгадовая школа палітасветработнікаў у Менску з новым наборам студэнтаў.

Яшчэ горш абстаіць справа з укамплектаваннем выкладчыцкіх кадраў. ЦК КП(б)Б гэта справа была даручана Наркомасветы т. Дзякаву, але ён нічога не зрабіў. Тав. Дзякаў укамплектоўвае школы дрэннымі выкладчыцкімі кадрамі. Так, у якасці загадчыка навучальнай часткі быў накіраван загадам наркома выключаны з партыі за контрэволюцыйныя трацкісцкія справы нейкі Гінзбург. Былы дырэктар тав. Карабан адмовіўся яго прыняць на работу, але т. Дзякаў не захацеў нават выслухаць дырэктара аб прычынах і патрабаваў выканання свайго загада. Тады тав. Карабан упарта адмовіўся яго выконваць. Роўна праз два тыдні Карабана выклікаюць да тав. Дзякава. Ён мімаволі выслухоўвае матывы непрыёму на работу трацкіста Гінзбурга і піша загад: «З прычыны таго, што Гінзбург за гэты час не прыступіў да работы загадчыка навучальнай часткі, ранейшы загад адмяніць». Вось характэрны стыль работы Дзякава.

Школа па сутнасці справы мае двух гаспадароў — аддзел культасветработы ЦК КП(б)Б і Наркомасветы, але і першы і другі школай займаюцца наогул, а што датычыць Наркомасветы, то там толькі дабіваюцца паперак на выпадак «як-бы чаго не атрымалася». Так, напрыклад, дырэктар школы т. Талкачоў не можа вырашыць у Наркомасвеце, па якіх стаўках выплачваць выкладчыкам. Па некалькі разоў ён ходзіць ад Дзякава да Гершона і наадварот, а толку няма.

Такія адносіны Наркомасветы зрывае работу школы. Школа не мае цвёрдага раскладу заняткаў, а трымае спецыяльна тэх нічнага работніка, які па вечарах раз'язджае да выкладчыкаў і паведамляе, якія лекцыі ўключаны назаўтра.

Аб стылі работы загадчыка аддзелам культасветработы ЦК КП(б)Б т. Ткачэвіча дастаткова прывесці такі факт. Тав. Ткачэвіч удастоіў адзін раз прысутнічаць на партыйным сходзе і ўся яго «выхаваўчая работа» і «дапамога» заключалася ў тым, што ў сваім выступленні ён абазваў рад таварышоў словамі «разанская баба» і інш.

Гаркому і Варашылаўскаму райкому неабходна аказаць партыйнай арганізацыі школы канкрэтную дапамогу. Гарком партыі павінен улічыць тое, што комуністы школы на партыйным сходзе заяўлялі, што аб існаванні гаркома яны не ведаюць, а Варашылаўскі райком яны ведаюць з таго, што ўзяліся там на партыйны ўлік.

ГУРАЛІС.

ЯК У УЗДЗЕНСКІМ РАЁНЕ АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЬ РАШЭННІ ЦК ВКП(б)

Справаздачна-выбарчая кампанія нізавых парторганаў Уздзенскага раёна пачалася з пярвічнай партарганізацыі РК КП(б)Б. Пачынаючы выбары, сакратар райкома т. Бацыраў, відавочна, меркаваў паказаць узор арганізаванасці правядзення партсходаў на высокай палітычнай вышыні, каб на гэтым сходзе вучыліся і ўсе астатнія пярвічныя партарганізацыі.

На жаль, добрае пажаданне не збылося на практыцы. Сакратар парткома гэтай пярвічнай партарганізацыі т. Пікус у сваім справаздачным дакладзе не разгарнуў папраўднаму самакрытыкі. Слухаючы яго даклад, ствараласа ўражанне, што гэты чалавек зразумеў лозунг партыі крытыкаваць не глядзячы на асобы па-свойму. Гэта значыць, крытыкаваць апусціўшы вочы ўніз.

Мала падправілі сакратара парткома і астатнія ўдзельнікі партсходу, не ўзялі з усёй вастраты пытання аб тым, як практыка каптацыі ў бюро РК, якой асабліва захапляліся члены бюро РК тт. Бацыраў, Бабкоўскі, Аронаў і інш., адкрывала доступ на кіруючыя пасады заклятым ворагам народу—трацкістам Рогаву, Сарэнзону і інш. двурушніцкім элементам. Не ўскрыты з усёй сур'ёзнасцю элементы дабрадушнасці, ратазейства і бесклапотнасці, маючыя месца ў гэтых партарганізацыях.

Грубыя памылкі дапушчаны і пры выбарах парткома. Па-першае, не было сур'ёзнага абмеркавання высоўваемых у партком кандыдатур. Абмяркоўваючы кандыдатуру тав. Пікуса, запыталі ў яго, ці мае сувязь з трацкісткімі элементамі. Ён адказаў адмоўна і скромна замаўчаў той факт, што мае родственную сувязь з соцыяльна-варожымі элементамі, асужданымі за антыдзяржаўныя злачынствы. Аб гэтым хоць і ведалі многія комуністы, але чамусьці не палічылі патрэбным сказаць, як быццам-бы такое пытанне не мае адносін і не заслугоўвае ўвагі пры абмеркаванні кандыдатур у склад парткома.

У партарганізацыях дапушчаны скажэнні дырэктыў ЦК ВКП(б) аб выбарах парторгаў. У пярвічнай партарганізацыі райаддзялення НКУС загадзя закулісным парадкам намячалі кандыдатуру парторга. У падліку вынікаў тайнага галасавання прысутнічаў інструктар РК КП(б)Б т. Аронаў, які не з'яўляецца членам гэтай пярвічнай партарганізацыі.

Аналагічнае парушэнне дырэктывы ЦК дапушчана і пры выбарах у пярвічнай партарганізацыі рэдакцыі райгазеты «Калгаснік Уздзеншчыны».

На нізкім палітычным узроўні прайшоў сход пярвічнай партарганізацыі механізаванага пункта Нёманскага лесаўчастка. Сам парторг тав. Фішбейн беспрынцыпна, падаляючы славаслоўі аб тым, каму з рабочых адрамантавалі печку, каму далі грошы на вяселле, а аб палітычнай слепаце комуністаў, не ўскрыўшых прычын частых аварый на пункце і праўленага ратазейства да ворагаў, сарваўшых насценгазету напярэдадні выбараў, гаварыў як аб другарадных фактах.

Усе гэтыя факты гавораць аб недастатковай падрыхтаванасці райкома і пярвічных партарганізацый да выбараў парторганаў.

Ці не трэба райкому ў інтарэсах разгортвання партыйнай работы адмяніць сям-там і, перш за ўсё, у самім райкоме, правядзенне выбараў?

Я. ІВАШЫН.

Вынік дабрадушнасці і прытуплення большэвіцкай пільнасці

На магілеўскай шаўковай фабрыцы доўгі час арудвала група прозраных трацкістаў, якія разам з фашысткімі спецыялістамі наладжвалі аварыі, распаўсюджвалі контрэволюцыйныя лістоўкі, выводзілі са строю абсталяванне. Дабрадушнасць, падхалімства, прытупленне большэвіцкай пільнасці і адсутнасць самакрытыкі ў партарганізацыі дала магчымасць 7 трацкістам, яўным ворагам народа, пры абмене атрымаць партбілеты. Аднаму трацкісту Пеўзнеру партком нават зняў спагнанне. І толькі потым усе яны былі выкрыты і выключаны з партыі.

Аб гэтым самакрытычна гаварыў сакратар парткома тав. Хрыпач у сваёй справаздачы на партыйным сходзе 30 сакавіка.

— Але было-б вялікім злачынствам,—гаворыць ён, — на гэтым супакоіцца, і лічыць што ўсе ворагі ўжо выкрыты, што можна пачываць на лаўрах. Ніякіх падстаў для самасупакаення няма. Наадварот, факты сігналізуюць аб адваротным.

Зусім нядаўна выяўлена 16 пунктаў з аголенымі правадамі высокага напружання. Гэта справа рук ворага была разлічана на поўную астаноўку ЦЭЦ і, такім чынам, усёй фабрыкі.

Дабрадушнасць, прытупленне пільнасці ў партарганізацыі — гэта парокі не толькі мінулых дзён. Яны маюць месца і зараз. Член партыі Гусін утойваў у сябе дома выключанага з партыі брата трацкіста. Але да гэтага часу партком гэтай справы не разглядаў. Да апошніх дзён у апаратнай фабрыкі працавала жонка фашыста, яўнага шкодніка Дуброўскага. Калі яна рашыла аставіць Магілеў, то ёй, на вачах усіх, начальнік адміністрацыйна-гаспадарчага аддзела Вайсбурд з ведама тэхнічнага дырэктара, кандыдата партыі Марыева, праз майстра комуніста Цішаева адпусціў бясплатна 30 метраў матэрыялу для ўпакоўкі чамаданаў, адпусціў скрыні і арганізаваў ўпакоўку не рэчаў. І ні ў каго не знайшлося большэвіцкай мужнасці даць па руках гэтым, мякка кажучы, гнілым лібералам. Тав. Хрыпач са спазненнем прызнае віну парткома ва ўсёй гэтай справе.

На фабрыцы не любяць самакрытыкі. А дырэктар фабрыкі Храменкоў яе проста заціскае. Калі загадчык матальнага пэха Канавалаў пакрытыкаваў Храменкова ў рэённай газеце, ён выклікаў яго да сябе ў кабінет і прачытаў натацыю, прапанаваў падаць заяву аб «адстаўцы». Гэты абураючы факт ганення за крытыку быў вядомы тав. Хрыпачу, аднак, як ён сам прызнае, ліберальна падышоў да ацэнкі яго і абмежаваўся сямейным вырашэннем пытання.

Палітвыхаваннем комуністаў партком мала займаўся, не было дыферэнцыяванага падыходу да ўкамплектавання школ і гурткоў, прапагандысты часта мяняюцца. Якасць палітагітацыі таксама нізкая. Агітатары праводзяць гутаркі без падрыхтоўкі. Партком гэтай справай не кіраваў.

Работу са спачуваючымі характарызуе адзін факт, прыведзены самім дакладчыкам. На фабрыцы 117 спачуваючых. Партком увесь час лічыў работу сярод іх здавальняючай. Але нядаўна адбыўся такі выпадак. Райком партыі запрасіў спіс спачуваючых з указаннем, якія партыйныя даручэнні выконвае кожны. У парткоме яго не аказалася. Пачалі збіраць весткі па партгрупах і тады выявілася, што палова спачуваючых не маюць ніякіх партыйных даручэнняў. Гэта было навіною для парткома.

Тав. Хрыпач раскрытыкаваў метад кіраўніцтва райкома партыі, пяведанне людзей. Нядаўна звоніць яму інструктар райкома тав. Казакоў:

— Прышлі неадкладна да мяне трох комуністаў (пералічвае якіх).

— Для чаго? — пытае Хрыпач. Яны зараз працуюць.

Казакоў адказвае:

— Патрэбна паслаць на курсы паштовых работнікаў.

— Але гэта бязглуздзіца. Названыя таварышы—зменныя інжынеры фабрыкі.

— Ага, ты не хочаш іх адпусціць!—крычыць Казакоў,—я сам вазьму.

Гэта анекдот, але ён характарызуе стыль кіраўніцтва.

Дрэнна кіруе партыйнай прапагандай культпроп райкома партыі тав. Гутман. Ён ні разу не быў на фабрыцы. Не азнаёміўся з работай школ і гурткоў. Сакратары райкома тт. Клімчук і Кузьмін таксама мала цікавяцца жыццём партыйнай арганізацыі фабрыкі.

— Калі мяне сустракае сакратар райкома тав. Клімчук, — гаворыць парторг хімічнага корпуса Падбярозкін, — ён заўсёды пытае, як выконваецца план, а аб маёй рабоце, як парторга, ён не цікавіцца.

Спрэчкі першага вечара — толькі нясмелы пачатак сапраўды большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі.

Р. ДОДЗІН.

БЮРАКРАТЫЧНАЯ БАЛБАТНЯ

У інфармацыйным пісьме Касцюковіцкага РК КП(б)Б гаворыцца: «Справаздачна-выбарчы сход пярвічнай партарганізацыі райкома КП(б)Б прайшоў з нізкай актыўнасцю... Дзейнасць парткома была падвергнута жорсткай крытыцы».

У пацверджанне гэтага прыводзяцца выступленні раду комуністаў.

Паглядзім, што называецца ў Касцюковіцкім раёне «жорсткай крытыкай».

Возьмем выступленне самаго сакратара РК КП(б)Б т. Ліскові ча: «Сакратар парткома т. Чачулін член КП(б)Б з 1919 года, а ў рабоце не праявіў ніякай ініцыятывы і бяздзейнічаў. Вінавят у гэтым я, як сакратар райкома КП(б)Б. Мяне мала крытыкуюць, а ў маёй рабоце ёсць шмат недахопаў і памылак».

Ні аднаго факта, ні аднаго прозвішча (калі не лічыць сакратара парткома, якога абыйсці было немагчыма).

Гэта не жорсткая крытыка, а бюракратычнае скажэнне самакрытыкі. Апрача імкнення адбалбатацца і змазаць крытыку тут нічога няма.

Такая «крытыка» работы пярвічнай партарганізацыі, ў якой саставіць Ліскові ч, садзейнічала таму, што і другія члены партыі не ўзняліся вышэй.

Гаварыць аб правале работы ў партарганізацыі, але ні аднаго вінаўніка не называюць. Вінавят партком, гаворыць выступаючыя, але тут-жа спяшаюцца падзяліць віну і ўзяць частку яе на сябе.

Відома, за правал работы адказвае і партком і партарганізацыя ў цэлым, якая не ўдзейнічала на партком, але ўсё-ж ёсць канкрэтныя вінаўнікі.

Чаму не названы яны па прозвішчах, чаму ім канкрэтна не прад'яўлена патрабаванне даць адказ партарганізацыі. Тое-ж і аб кіраўніцтве РК КП(б)Б. Чаму ўсе таварышы гавораць «наогул».

Гэта тлумачыцца тым, што ў пярвічнай партарганізацыі Касцюковіцкага РК крытыка і самакрытыка па-сапраўднаму не разгорнута.

Райком павінен папярэдзіць спробу бюракратаў адбалбатацца і тым аслабіць разгортванне самакрытыкі.

АЛАМАХА.

ЧЭРЫКАЎСКІЯ ВЯЛЬМОЖЫ

У Чэрыкаўскай партарганізацыі большэвіцкая крытыка і самакрытыка не ў пашане, а крытыкаваць ёсць што, ёсць вельмі шмат недахопаў. Узяць хоць-бы такія абураючыя агіднасці, якія мы маем у соўгасе «Чырвоны Кастрычнік». Носьбітамі гэтых агіднасцей з'яўляецца ніхто інны, як начальнік палітаддзела соўгаса Сыраешка і дырэктар Гаспадарык. Гора-кіраўнікі соўгаса ўмудрыліся толькі за 4 месяцы аштрафаваць за недысцыплінаванасць 25 рабочых соўгаса на суму 800 рублёў. Гэтыя-ж два самадуры робяць сістэматычныя вобыскі ў рабочых. Такім вобыскам падвергліся Высоцкі, Срэзанкоў і інш. Пры вобыску ў іх шукалі зярно, сена, бульбу. Перарылі ўсе скляпы, скрыні і пасцелі. Не дзіўна, што рабочыя на апошнім сходзе называлі Сыраешка памешчыкам, зажымшчыкам крытыкі. Прыходзіцца толькі здзіўляцца наколькі такія людзі, як Сыраешка, страціўшы аблічча палітычных кіраўнікоў і выхавальнікаў мас.

Ёсць яшчэ трэці, ім падобны, гэта — старшыня райвыканкома Кучаравы. Яго партарганізацыя ведае не інакш як бюракрата, п'яніцу і зажымшчыка крытыкі. 9 сакавіка адбыўся раённы партыйны сход, дзе абмяркоўвалі рэзалюцыю Пленума ЦК ВКП(б) па дакладу тав. Жданава. Для многіх удзельнікаў гэтага схода было вялікай навіной, калі выступіўшы член партыі ўказаў на тое, што Кучаравы п'яніца, грубіян у абыходжанні з наведвальнікамі, выганяў з кабінета калгаснікаў, якія звярталіся да яго з вострымі скаргамі. Кучаравага такое выступленне вельмі зняважыла. Не вытрымаў ён, узяў слова і заявіў: «Я прыслан у ваш раён ЦК партыі як палітычна пісьменны чалавек, а вы мяне думаеце выпраўляць».

На пасяджэнні райкома партыі, дзе гаварылася аб тым, што трэба пачаць разгортваць самакрытыку, Кучаравы ўзяў слова і гаворыць: «У нас крытыка ляецца праз краі, трэба крытыкаў сур'ёзна адзёрнуць, а крытыку адрэгуляваць». Такія выступленні з боку Кучаравага не найшлі належнага адпору. Трэба спадзявацца, што Чэрыкаўская партарганізацыя апэніць па заслугах «справы» зарваўшыхся вяльмож.

ЗЕМЦЭУ.

У ТАЛОЧЫНСКАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

У талочынскай арганізацыі праведзены справаздачна-выбарчыя сходы пярвічнай партарганізацыі РК КП(б)Б і камітэта загатовак. У партарганізацыі РК КП(б)Б з 15 комуністаў, прысутнічаўшых на сходзе, выказалася 10. Вострай крытыкі не было. Сакратара райкома тав. Каменштэйна крытыкавалі нясмела. Крытыка абмежавалася тым, што Каменштэйну ўказалі, што ён рэдка бывае на сходах сваёй пярвічнай партыйнай арганізацыі, не наведвае сходаў Асоавіяхіма. Вось і ўсё. І гэта ў Талачыне называецца смелай крытыкай, не зважаючы на асобы.

Не было рашучай крытыкі недахопаў і разгорнутай самакрытыкі таксама на сходзе партыйнай арганізацыі-камітэта загатовак. А між тым тут пышным букетам квітнее падхалімства ў адносінах да старшыні райвыканкома тав. Конікава. Нехапае мужнасці адзёрнуць падхалімаў. Падхалімства не прасечана.

В. З.

ЯК АРШАНСКІ РАЙКОМ САМ СЯБЕ ПАДПРАВІЎ

Нядаўна ў Оршы закончыла сваю работу чацвертая раённая партыйная канферэнцыя. На канферэнцыі слухаўся справаздачны даклад райкома (сакратар райкома тав. Соскін). Каб «не затрудняць» дэлегатаў, бюро райкома падрыхтавала праект рэзалюцыі па справаздачнаму дакладу. Канферэнцыя, аднак, не згадзілася з праектам і, адвергнуўшы яго, тут-жа выпрацавала новую пастанову па справаздачнаму дакладу, даручыўшы райкому адрэдагаваць яе.

19 дзён аршанскі райком рэдагаваў пастанову. Комуністы нецярпліва чакалі сваёй рэзалюцыі. У друку з'явіліся матэрыялы, патрабуючыя апублікавання яе. Нарэшце райком ашчаслівіў грамадзян раёна, перадаўшы рэзалюцыю ў рэдакцыю раённай газеты. 9 сакавіка рэзалюцыя паступіла ў друкарню газеты і ў 4 гадзіны дня была здана ў набор. У 7 гадзін вечара таго-ж дня раздаўся званок.

— Нясіце рэзалюцыю,—пачуўся голас тав. Соскіна, — це прыдзецца перарабіць.

Дырэктар друкарні панёс гранкі набранай рэзалюцыі ў райком для «перапрапоўкі». Доўга ці коратка перапрацоўвалася рэзалюцыя, словам, аршанцы ўбачылі яе, нарэшце, у друку. А ўбачыўшы, здзівіліся. І было чаму здзіўляцца. «Пастанова» адрозніваласа не толькі ад дакумента, прынятага канферэнцыяй, але і нават ад першага дакумента, пасланага самім райкомам у рэдакцыю.

Прыглядзься, чытач, да гэтых дакументаў і ты ўбачыш рэзультаты «лоўкай работы».

Вось некаторыя прыклады з прысланых у рэдакцыю раённай газеты дакументаў.

Дакумент № 1. У пункце другім гэтага дакумента сказана:

«Разам з гэтым IV райпартканферэнцыя адзначае, як выключна недапушчальнае з'явішча, наяўнасць самасупакоенасці ў партарганізацыі, элементы захаплення гаспадарчай работай, да канца не ўлічаны ўрокі, вынікаючыя з праверкі і абмену партыйных дакументаў, з працэсаў над прадажнікамі і здрадніками радзімы, агентамі фашысцкіх контрразведак, подлымі шпіёнамі і дыверсантамі, падручнымі бандыта Троцкага».

Дакумент № 2. У гэтым дакумэнце той-жа пункт «адрэдагаван» так:

«Разам з гэтым IV райпартканферэнцыя адзначае, як выключна недапушчальнае з'явішча, наяўнасць пасля праверкі і абмену партдакументаў элементаў самасупакоенасці ў партарганізацыі. Усё яшчэ да канца не вынесены ўрокі, вынікаючыя з праверкі і абмену партдакументаў».

Паправачкі характэрны. Райком не згадзіўся з тым абвінавачваннем, якое яму кінула раённая партыйная канферэнцыя. Па яго думцы, урокі, вынікаючыя з працэса над прадажнікамі і здрадніками радзімы, агентамі фашысцкіх контрразведак, подлымі шпіёнамі і дыверсантамі, падручнымі бандыта Троцкага—райкомам улічаны. Ці правільна гэта? Дастаткова спаслацца хоць-бы на факты, якія мелі месца на мясакамбінаце, каб сказаць, што права канферэнцыя, а не райком. Навошта-ж патрабавалася тав. Соскіну выкрэсліваць гэты пункт з рэзалюцыі? Можа быць у інтарэсах павышэння рэволюцыйнай пільнасці? Няцяжка бачыць, што, выкрэсліўшы гэты пункт, тав. Соскін садзейнічаў не павышэнню, а аслабленню рэволюцыйнай пільнасці, не павышэнню, а аслабленню ўзброенасці комуністаў у барацьбе з арудуючым у Оршы ворагам.

Тав. Соскін унёс шмат паправак у рэзалюцыю. Усе яны адналькавыя і маюць адну цану: аслабіць крытыку райкома. Не будзем прыводзіць усе гэтыя паправкі. Спынімся толькі на адной з іх.

Дакумент № 1. У гэтым дакумэнце сказана:

«Канферэнцыя лічыць слабай сувязь кіруючага райпартактыва з масамі працоўных».

Дакумент № 2. Той-жа пункт у гэтым, другім, дакумэнце «перапрацаван» наступным чынам:

«Канферэнцыя лічыць недастатковай сувязь райпартактыва з масамі працоўных».

І без каментарый відаць, што мяккае ўказанне раённай партыйнай канферэнцыі на адрасу райкома прышлося не па нутру кіраўнікам яго. Тав. Соскін выкрэсліў усяго толькі адно слова, а сэнс, як бачыце, атрымаўся зусім іншы. Удар ад сябе адведзен. У рэзалюцыі узведзен паклёп на раённы партактыў. Але гэта, як відаць, не кранула тав. Соскіна, які захапіўся «лоўкай работай».

Незразумела, чаму тав. Соскін праробіў такую работу. Што гэта, палітычнае недамыслие, або свядомае папіранне правёў партканферэнцыі?

А. Р.

ГАЛОЎНЫЯ ПЫТАННІ АБЫХОДЗЯЦЬ

Надзвычайна мяккім ідэйным узроўнем і адсутнасцю сапраўднай крытыкі характэрны спрэчкі па справаздачы парткома, якія адбываліся 1 красавіка у партарганізацыі менскага горсовета. Крытыкавалі, галоўным чынам, радавых комуністаў па асобных практычных пытаннях іх работы. Занадта многа ўвагі ў спрэчках было аддана пытанням работы штаба мясцовай супроцьпаветранай абароны.

Дзіўным было выступленне тав. Жуковіча. Гэта фактычна была чарговая пакаянная прамова («Мы, як належыць, не працуем», «горсовет адарваны ад мас», «мы не выхоўваем апарат» і т. д.). Хоць ён не кальні разоў спасылаўся на рашэнні Пленума ЦК ВКП(б), на прамову таварыша Сталіна і яго заключнае слова, аднак, не відаць было, каб т. Жуковіч зразумеў па сутнасці гэтыя гістарычныя дакументы. Іменна з гэтай прычыны т. Жуковічу не было чаго расказаць сходу аб тым, што ён практычна ўжо зрабіў для карэннага паляпшэння работы горсовета.

Між іншым і т. Жуковічу і ўсім астатнім удзельнікам схода вядома, што ў апараце горсовета існуюць такія з'явішчы, як падхалімства, сямейственасць, угодніцтва, ёсць факты прыгнячэння пільнасці. Аднак, у спрэчках гэтыя важныя пытанні амаль не закраналіся.

Тав. Кузняцова (загадчык гаража), выступіўшая ў канцы схода, зусім справядліва выказала ў сваёй прамове абурэнне па зместу спрэчак, у якіх абыходзяцца маўчанне істотных недахопы і буйнейшыя памылкі работы партыйнай арганізацыі. Факт замоўчвання ў дакладзе сакратара парткома т. Сакольчыка алмоўных бакоў работы некаторых кіруючых работнікаў горсовета, у прыватнасці т. Жуковіча (аб чым было запісана ў справаздачы парткома, зацверджанай на яго пасяджэнні), сведчыць аб тым, як у партарганізацыі горсовета дрэнна абстаіць справа з крытыкай і самакрытыкай.

АЛ. ЛЕБЕДЗЕЎ.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА СТАХАНАЎЦАЎ— ПЕРАДАВІКОЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Знатныя стахановцы сельскай гаспадаркі БССР, дэлегаты ўсебеларускай нарады перадавікоў ураджайнасці. НА ЗДЫМКУ: (справа налева) тт. Барушкоў з калгаса «Гомельскі пролетарый» Лоеўскага раёна, Ганус з калгаса «Кастрычнік» Дрысенскага раёна і садавод калгаса «Дняпроўская комуна» Сіракоўскі ў часе пасяджэнняў усебеларускай нарады стахановцаў—перадавікоў сельскай гаспадаркі.

Фото Я. Салавейчыка.

Учора працягваліся выступленні дэлегатаў. Адзін за другім выступалі стахановцы ўраджаю і перадавікі падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, выкрываючы прычыны адставання сваіх калгасаў, раёнаў, рэспублікі.

Намеснік старшыні калгаса «Перамога» Дрысенскага раёна тав. Абуховіч адзначыла дрэнную работу раённых арганізацый.

— У мінулым годзе, — гаворыць тав. Абуховіч, — я, будучы звеннявой, абавязалася атрымаць з гектара 1.000 кілаграм ільнавалакна. З гэтай работай я не справілася, бо ні старшыня калгаса, ні брыгадзір звяну не дапамагалі.

Далей тав. Абуховіч гаворыць, што і калгас не меў ніякай дапамогі. Кіраўнікоў раёна бачылі толькі тады, калі яны праязджалі міма хат, а калі і спыняліся, то замест дапамогі лаялі калгаснікаў.

Дрэнна ў раёне з вылучэннем жанчын на кіруючую работу. Тав. Абуховіч за тры месяцы сваёй работы не бачыла дапамогі, не чула ніякіх парад як траба працаваць.

Старшыня Клясціцкага сельсовета Расонскага раёна тав. Нікалаенка крытыкуе работу райза і МТС. Кіраўнікі гэтых арганізацый, — гаворыць яна, — усю работу з калгаснікамі праводзяць габінетным парадкам, у калгасах бываюць рэдка і то праездам.

— Хіба гэта дапамога ў рабоце, — гаворыць старшыня Страліпчанскага сельсовета Вешакавіцкага раёна тав. Базылёў, — калі хто прыедзе з раённых работнікаў, то толькі ў старшыні запытае, як ідзе вызвака гною і інш., а з калгаснікамі не лічаць патрэбным пагаварыць? Ад раённага агранома калгасы сельсовета не атрымліваюць ніякіх парад, і райза на гэта глядзіць, як на звычайнае з'явішча.

Вось гаворыць звеннявая Рыбакова Марыя з калгаса імя Чарвякова, Мсціслаўскага раёна. Гэты раён — адзін з адстаючых у ВССР, знаходзіцца ў глыбокім прарыве, сустрэў веснавую сяўбу непадрыхтаваным. Звеннявая расказвае аб тым, што раённыя арганізацыі: райком КП(б)Б (сакратар т. Штэйнгарт), РВК (старшыня т. Рай) і райземаддзел (загадчык т. Кардовіч) не дапамагаюць калгасам, брыгадзірам і звеннявым, каб яны падрыхтаваліся да сяўбы.

— Аб нас у раёне забыліся, — кажа Рыбакова. — Ні райком, ні райвыканком не працуюць з людзьмі, не кіруюць стахановцамі сельскай гаспадаркі. У гэтым прычына адставання раёна, кіраўнікі якога адарваліся ад калгасаў, адарваліся ад мас.

5 год працуе брыгадзірам калгаса імя Максіма Горкага Гомельскага раёна т. Кавалёва.

— Але за гэты час, — расказвае яна, — не бачыла ў сваім калгасе раённых работнікаў, ка гаворачы ўжо аб аграномах. Брыгада не атрымлівае ні дапамогі, ні кіраўніцтва. У выніку калгас слаба падрыхтаваўся да веснавых работ, не засыпаў насення, не вывез на поле гной. І гэта нікольні не турбуе ні райземаддзел, ні райвыканком, ні райком партыі. Усе яны шарахнуліся ў бок ад сяўбы, пусцілі справу на самацёк.

Старшыня Шчэдрынскага сельсовета Парыцкага раёна тав. Дудкоў гаворыць аб слабой рабоце сярод аднаасобнікаў, што аб іх перад сяўбой забыліся.

— Калі звяртаемся да загадчыка райземаддзела з запытаннем дзе сеять аднаасобнікам, то ён адказвае: «Пакажы, а яны знойдуць». Толькі зараз аднаасобнікам даведзен план сяўбы. Да веснавых работ яны яшчэ не падрыхтаваліся. Паступаюць скаргі на няправільнае дзеянне сельсоветаў у адносінах аднаасобнікаў. Палітычна-масавая работа сярод іх у Парыцкім раёне не праводзіцца.

Аб дрэнным кіраўніцтве падрыхтоўкай да сяўбы расказаў у сваім выступленні старшыня калгаса «Трудавік» Дубровенскага раёна т. Аўсеенка.

Мы некалькі разоў звярталіся ў райземаддзел да загадчыка т. Халадок за дапамогай у матэрыялах для пратручвання насення. Халадок і слухаць не хоча. «Едзьце ў Оршу і там бярыце фармалін», — заяўляе ён. Гэты прыклад сведчыць аб поўнай бясклопатнасці кіраўніцтва Дубровенскага райземаддзела. У раёне не арганізавана абмен насення. У калгасе «Трудавік» ёсць для міжкалгаснага абмену 130 цэнтнераў гатункавай шпанцы. Калгасы-ж не абменьваюць, а райземаддзел ад іх нічога не патрабуе.

— Лагойская МТС, — кажа т. Сенюкевіч, — сустрэла веснавыя работы непадрыхтаванай. Прыцэпны інвентар, як плугі, бароны і інш. яшчэ не адрамантаван. Частка іх парасхідана па ўсіх калгасах. МТС не мае сувязі з калгасамі, якія яна абслугоўвае, не арганізоўвае на месцы работу па большэвіцкаму правядзенню веснавой сяўбы.

Аб гэтым гаворыць многія дэлегаты. Яны в усёй сур'ёзнасцю крытыкуюць нездавальняючую работу МТС і райземаддзелаў. З выступлення старшыні калгаса «Пераможан» Асвейскага раёна т. Доазда яшчэ раз відаць, як раённыя арганізацыі дрэнна кіруюць калгасамі. Ці раён, ні Кісялёўскі сельсовет не ведае, як яго калгас падрыхтаваўся да сяўбы.

Участковы аграном з Сенненскага раёна т. Фамічэва прад'явіла Наркомзему БССР т. Бенеку рахунак — больш кіраваць спецыялістамі сельскай гаспадаркі.

— Як-жа Наркомзем,—пытаецца т. Фамічэва, — дапамагае ў рабоце аграномаў? Наркомзем кіруе намі толькі на паперы, не трымае з намі сувязі. Мы патрабуем ад Наркомзема такой дапамогі ў рабоце, якой патрабуюць ад нас калгасы. Гаворачы аб севазваротах, т. Фамічэва адзначае, што гэтым пытаннем не займаецца ні райземаддзел, ні Наркомзем БССР. Севазваротаў у раёне няма. Аграномы райземаддзела і МТС не ўводзяць севазваротаў, ламаюць іх там, дзе яны ўведзены. У Сенненскім раёне няма ні адной хаты-лабараторыі. Наркомзем не дапамагае, а райземаддзел не займаецца гэтай важнейшай справай.

З прамовай выступіў нарком земляробства БССР т. Бенек. Ён гаварыў таксама аб севазваротах, рабоце аграномаў, насенных участках, МТС і інш. Хоць т. Бенек гаварыў аб крытыцы, што яна дапамагае выпраўляць недахопы, сам-жа не быў самакрытычным.

Чаму такая чахарда з севазваротамі?

Нарком імкнецца тлумачыць гэта выдачай актаў на вечнае карыстанне зямлёй. Даведзеныя планы севазвароту ў раёне асталіся ляжаць у райземаддзелах, калгасы аб іх не ведаюць. У 1937 годзе, як паведаміў т. Бенек, будуць даведзены севазвароты да 2,5 тыс. калгасаў, а астатнія павінны займацца ўладзеннем іх самі. Кранаючыся вывазкі мінеральнага ўгнаення, т. Бенек узваліў віну на заводы. А як Наркомзем клапоціцца аб угнаеннях, аб гэтым дэлегаты не пачулі.

Наркомзем БССР слаба займаецца пытаннямі падрыхтоўкі да сяўбы. Усё кіраўніцтва раёнамі і калгасамі падмяніў канцылярскім кручкатворствам, не арганізаваў работы райземаддзелаў. Нарком т. Бенек абышоў сваю нездавальняючую работу маўчаннем. Ён гаварыў, што нельга дапускаць на поле паспраўныя трактары, прыводзіў факты шкодніцтва. А як Наркомзем БССР кіруе МТС і ў асаблівасці новымі? Ці не з'яўляецца дрэнная падрыхтоўка МТС да сяўбы віною Наркомзема?

На нарадзе выступіў таксама старшыня ЦВК БССР тав. Чарвякоў, які адзначыў, што ў Мозырскай акрузе пачаліся палявыя работы, а калгасы да сяўбы не падрыхтаваліся. Тут яшчэ поўнасцю не адрамантаваны інвентар, не вывезен гной, не абменена насенне і т. д. Мозырская акруга праспала падрыхтоўку да сяўбы. Тое самае і ў Полацкай акрузе. Не бліскуча таксама справа ў Менскім раёне. Загадчык райземаддзела т. Кляўко не займаецца сяўбой, груба абыходзіцца са старшынямі калгасаў.

— Нашы сельсоветы, — кажа тав. Чарвякоў, — не ведаюць або зусім дрэнна ведаюць, як калгасы, аднаасобнікі і саўгасы падрыхтаваны да сяўбы. Не ведаюць аб севазваротах, цягавай сіле і т. д.

Тав. Чарвякоў прывёў многа фактаў парушэння сталінскага статута сельгасарцелі, якое дапускалі сельсоветы, звярнуў увагу на ўрокі лепельскай справы, на перабудову работы сельсоветаў. Але тав. Чарвякоў не сказаў з усёй праматой аб недахопах у рабоце цэнтральных арганізацый, нездавальняючым кіраўніцтве сельсоветаў з боку асобных аддзелаў ЦВК у падрыхтоўцы і правядзенні сяўбы.

У канцы нарады з прамовай выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч. Ён крытыкаваў работу земельных органаў і Наркомзема, раённых партыйных арганізацый за дрэннае кіраўніцтва сяўбой. Не толькі ў Наркомземе, але і ў раёне, як указаў тав. Шаранговіч, дрэнна звязаны з калгасамі. Падрыхтоўку да сяўбы праспалі, пачынаючы ад цэнтральных арганізацый і канчаючы раённымі. Тав. Шаранговіч звярнуў асаблівую ўвагу на павелічэнне ўраджайнасці, няўхільнае правядзенне ў жыццё сталінскага статута сельгасарцелі, на работу сярод аднаасобнікаў і ліквідацыю дапушчаных перагібаў.

Нарада заключыла дагавор па соцыялістычнаму спаборніцтву БССР з Заходняй вобласцю і звярнулася з адозвай да ўсіх калгаснікаў і калгасніц, спецыялістаў і вучоных сельскай гаспадаркі БССР.

На гэтым учора закончыла сваю работу ўсебеларуская нарада стахановцаў—перадавікоў сельскай гаспадаркі.

Шкодныя тэндэнцыі ў рабоце Дзяржплана БССР

Яшчэ зусім нядаўна ў Дзяржплане БССР арудвала банда ворагаў народу — трацкісты і нацдэмы на чале з старшынёй Дзяржплана зброеносцам Троцкага Галендай. Прыкрываючыся партыйнымі білетамі, яны скарысталі палітычную бестурботнасць некаторых кіруючых работнікаў рэспублікі і прабраліся на самыя адказныя ўчасткі работы. У іх руках аказалася планіраванне важнейшых галін народнай гаспадаркі БССР. Начальнікамі буйнейшых аддзелаў: зводнага плана, тавараабароту працавалі махровыя трацкісты Чудноўскі і Лейзін, аддзелы капітальнага будаўніцтва, прамысловасці і энергетыкі ўзначальвалі нацдэмы Асташонак і Валасевіч.

Нямала нашкодзілі народнай гаспадарцы гэтыя ворагі. Усялякімі метадамі яны зрывалі капітальнае будаўніцтва, распылялі сродкі, амярцвялі капіталаўкладанні, скрывалі сапраўдную магутнасць фабрык і заводаў. Асобныя прадпрыемствы будаваліся па яўна шкодніцкіх планах. Развіццё прамысловасці на мясцовай сыравіне ўсялях тармазілася.

Уся гэта контрреволюцыйная зграя ворагаў, намаганні якіх былі накіраваны на зрыў індустрыялізацыі БССР, на аслабленне яе магутнасці, была выкрыта партыяй і выгнана з Дзяржплана.

Новае кіраўніцтва Дзяржплана не зрабіла сур'ёзных урокаў з шкодніцкай контрреволюцыйнай дзейнасці трацкістаў,—яно не навяло большэвіцкага парадку ў планіраванні народнай гаспадаркі БССР.

Невыпадкова, што тэндэнцыі планавання па раду галін народнай гаспадаркі і зараз нагадваюць ва многім шкодніцкае планаванне. Яны, гэтыя тэндэнцыі, накіраваны на зрыў своечасовага выканання плана капітальнага будаўніцтва, на стварэнне разрыву паміж аб'ёмам капітальнага будаўніцтва і развіццём прамысловасці будматэрыялаў—гэтай неабходнейшай умовы для выканання плана капітальных работ. І цяпер у Дзяржплане не выкарчавана шкодніцкая практыка распылення сродкаў на мноства аб'ектаў, замест канцэнтравання іх на рашаючых, важнейшых. Развіццё галін прамысловасці, працуючых на мясцовай сыравіне, па-ранейшаму тармозіцца.

Па пастанове Саўнаркома СССР ад 11 лютага 1936 года запланавана будаўніцтва двух цэхаў па сухому прэсаванню цэглы. Пуск іх у эксплаатацыю вызначан—першы квартал 1937 года. Для развіцця цагельнай прамысловасці гэтыя цэхі маюць выключна важнае значэнне. Яны даюць магчымасць арганізаваць круглагадовую вытворчасць цэглы, палепшаць яе якасць, поўнасцю механізаваць працэс вытворчасці. Не выконваць пастановы СНК СССР небяспечна, таму ў Дзяржплане робяць інакш. Будаўніцтва цэхаў, як і продукцыя іх (4.600 тыс. штук цэглы), уключаецца ў план, заводам-пастаўшчыкам зроблен заказ на абсталяванне, але... грошы для іх набыцця не запланаваны. У выніку, каштоўнейшае абсталяванне на 2,5 млн. руб. ляжыць ужо доўгі час на станцыях Магілеў, Бабруйск, Менск і трэстам не выкупляюцца. Па цагельні № 2 запланавана пашырэнне гофманскай печы, якая павінна ўжо ў гэтым сезоне даць 2.300 тыс. цаглін. Ліміты не адпушчаны.

Нават у тых выпадках, калі сродкі на будаўніцтва запланаваны, яны размяркоўваюцца па тэрмінах такім чынам, што выключаецца магчымасць своечасовага выканання будаўнічых работ і поўнага эфектыўнага выкарыстання адпушчаных лімітаў. У 1936 г. з адпушчаных трэсту белбудматэрыялаў 8.021 тыс. руб. на І квартал было вызначана толькі 18 проц., хаця гэты квартал з'яўляецца рашаючым ў выкананні ўсяго гадавога задання. Сёлета паўтараецца зноў-такі мінулагодняя практыка.

У плане капіталаўкладанняў на 1937 г. запраектавана будаўніцтва двух заводаў натронавай вытворчасці з пускам іх у эксплаатацыю ў IV квартале. Для таго, каб сарваць своечасовае ўвядзенне ў эксплаатацыю гэтых аб'ектаў, у Дзяржплане знарок запланавалі ў два разы меншую супроць фактычнай каштоўнасці суму. Праектаў і каштарысаў Дзяржплан і да гэтага часу не разглядаў.

Улічваючы, што недахоп цэменту тармазіў і тармозіць ўсё ўграсталочы аб'ём будаўнічых работ, урад запраектаваў пабудову ў БССР новага цэментнага завода магутнасцю ў 25 тысяч тон у год. Здавалася-б, што гэта будаўніцтва патрэбна было ўзяць пад асобы нагляд і ўсялякі фарсіраваць яго. Вораг пастараўся прыкласці сваю руку для таго, каб сарваць будаўніцтва гэтага завода. Чым іншым можна вытлумачыць факт, што і цяпер у Дзяржплане яшчэ няма праектаў і каштарысу, невядомы кошт усяго будаўніцтва?

Ці выпадковы, напрыклад, такі факт, калі Дзяржплан запраектаваў у 1936 г. на капітальнае будаўніцтва аб'ектаў супроцьпажарнай аховы 760 тыс. руб., а начальнік аддзела матэрыяльных фондаў Кардашэнка не зрабіў заяўкі на будаўнічыя матэрыялы? У выніку гэта важнейшае народна-гаспадарчае мерапрыемства было сарвана.

Адным з метадаў шкодніцкага планавання было распыленне сродкаў на мноства аб'ектаў будаўніцтва з мэтай амярцвення капіталаў і запяжкі пуску ў эксплаатацыю важнейшых будоўляў. Як не дзіўна, але ў Дзяржплане БССР гэта практыка ўжывалася і па сёнешні дзень. Так, каштарысная вартасць будаўніцтва фарнітурнага завода складае 7627 тыс. руб. Да 1 студзеня 1937 г. затрачана 350 тыс. руб., па плану 1937 г. намечана асвоіць 1.600 тыс. руб., астатнія 5.877 тыс. руб., ці 75% каштоўнасці данага прадпрыемства мяркуюць асігнаваць у будучым годзе, г. зн. у год пуску яго ў эксплаатацыю. Характэрна, што каштарысы і праекты яшчэ Дзяржпланам не зацверджаны. Такі-ж лёс рэканструкцыі віцебскай акулярнай фабрыкі, менскай галантарэйнай фабрыкі імя Фрунзе, абутковай фабрыкі імя Кагановіча, новабарысаўскага шклозавода і інш.

Дзяржплан прапампаваў яўна шкодніцкі праект адной раённай ТЭС. Ён прагледзеў і шкодніцкую пабудову раду буйных млыноў (Уваравічы, Церахоўка, Лепель). Ці патрэбны тут лішнія доказы, што людзі, якія займаюцца такім, з дазволу сказаць, «планаваннем», твораць работу класавых ворагаў?

Хітра і ўмела дзейнічае вораг у аддзеле матэрыяльных фондаў. Тут як-бы «знянацку забываюць» запланаваць матэрыялы і абсталяванні на адказнае будаўніцтва, а то і проста не дабіваюцца атрымання неабходных фондаў.

Па плану 1937 г. запраектавана на будаўніцтва радзільных дамоў і ясляў 13.950 тыс. руб., на дзіцячыя сады — 6.800 тыс. руб. Відавочна, што першыя аб'екты патрабуюць матэрыялаў у два разы больш. Аддзел-жа матэрыяльных фондаў (начальнік Кардашэнка) «спланаваў» якраз наадварот. Так, круглага лесу меркавалася адпусціць радзільным дамам 5.000 кубаметраў, а дзіцячым садам — 6.800, цэменту адпаведна 1.930 тон і 2.300, катанкі адпаведна 20 тон і 42. Да чаго гэта магло прывесці — зусім ясна. Аднак у Дзяржплане гэта ўспрынялі як простую тэхнічную памылку(?!).

Менскаму вадаправоду яшчэ ў мінулым годзе запланаваны 2 цэнтрабежныя насосы. Яны даўно атрыманы, але аказалася, што Кардашэнка «запамятаваў» заказаць адначасова маторы для іх. Рэзультаты такога «планавання» вельмі добра адчуваюць працоўныя Менска. Горад штодзённа недаатрымлівае 245 тысяч літраў вады.

Калі павярхоўна прыглядзецца да плэніравання гарадской гаспадаркі, жыллёвага і комунальнага будаўніцтва, то складаецца ўражанне поўнага парадку на гэтым участку. Аднак, варта толькі глыбей азнаёміцца з гэтым пытаннем, і малюнак акажацца даволі непрыглядным.

Дзяржплан не можа не ведаць аб тым, колькі рабочых і служачых Менска і Віцебска штодзённа спазняюцца на работу з-за дрэннай работы трамвая. У Гомелі, Рэчыцы, Барысаве і інш. гарадах рабочыя вымушаны хадзіць па 4—5 кіламетраў пешшу на работу з-за адсутнасці дастатковай колькасці аўтобусаў. Што да ўсяго гэтага Дзяржплану? Тут існуе своеасаблівая «тэорыя» аб адміранні трамвая, як сродка гарадскога транспарту і што будучае належыць аўтатранспарту. Магчыма, Дзяржплан прыняў адпаведныя захады для пашэрэння аўтапарка значнай колькасцю машын? Не. Аб гэтым сведчыць факт, што ў І квартале па заяўцы Дзяржплана на ўсю рэспубліку атрымана толькі... 5 аўтобусаў.

У 1932 г. кіраўніцтва Наргасуліку БССР праводзіла перапіс комунальных прадпрыемстваў, у тым ліку і лазняў. Па гэтаму «перапісу» выйшла, што Менск, Гомель, Віцебск, Магілеў, Бабруйск і інш. гарады рэспублікі перанасычаны лазнямі. Замест сапраўдных 2449 месц па 10 гарадах рэспублікі, «налічана» 3996. Такі-ж «ўлік» умудрыліся правесці і ў 1935 годзе. Гэта гучыць парадаксальна, аднак яно не перашкаджае Дзяржплану кіравацца пры складанні планаў данымі шкодніцкага ўліку. Цяпер зусім зразумела, чаму ў гарадах і ў першую чаргу ў Менску з года ў год адкладваюць пабудову новых лазняў.

Вырашэнне важнейшых пытанняў народнагаспадарчага плана, разгляд праектаў і каштарысаў у Дзяржплане працягваецца месяцамі. Праблема арганізацыі вытворчасці керамічных труб на базе лоеўскіх глін марынуецца з 1934 г. Пытанне аб рэгуляванні стокаў вярхоўя ракі Свісляч разглядаецца з 1932 г. Начальнік комунальна-жыллёвага аддзела Дзяржплана тав. Пінскі 2 месяцы візіраваў праект гомельскай каналізацыі. Да гэтага часу яшчэ няма праекта станцыі біяачысткі ў Менску. Прапрапоўка такога важнейшага праекта як перавод напольных пячэй на тарфіны апал пягнецца ўжо 7 месяцаў.

Адным з асноўных абавязкаў Дзяржплана з'яўляецца сістэматычная праверка выканання ім-жа складзеных планаў. Аднак работнікі Дзяржплана па-свойму разумеюць свае функцыі. Замест праверкі яны рэгіструюць факт зрыву выканання важнейшых частак плана, невыкарыстанне адпушчаных сродкаў. Некаторыя аддзелы проста ператварыліся ў дрэнна-снабжэнчыя арганізацыі. Начальнік буйнейшага аддзела прамысловасці і энергетыкі тав. Чолах не ведае, як выконваецца народнагаспадарчы план хаця-б на буйнейшых аб'ектах. Іменна гэтым можна вытлумачыць, што з года ў год вялікія сумы грошай, адпушчаныя на капітальнае і жыллёвае будаўніцтва, не выкарыстоўваюцца.

Усё гэта не з'яўляецца рэзультатам якіх-небудзь выпадковых памылак або тэхнічнай непісьменнасцю таго ці іншага работніка. Не, справа не ў гэтым. Бяда ў тым, што частка кіруючых работнікаў Дзяржплана—комуністы занядужалі ідыёцкай хваробай—бесклапотнасцю, палітычнай слепатой. Яны праглядзелі, што ворагі іх ашукваюць, карыстаючыся празмернай даверлівасцю.

Начальнік прамысловага аддзела комуніст Чолах перадаверыў важнейшы ўчастак работы—планаванне цяжкай прамысловасці (металаапрацоўчая, хімічная прамысловасць і будматэрыялаў)—старшаму эканамісту Чэбатараву, які ў свой час выступаў супроць лініі партыі, узводзячы на яе паклёпы. Невыпадкова, што іменна на гэтым участку больш за ўсё «недарэчнасцяў».

Эканамістам аддзела зводнага плана да апошняга часу працавала Буніна—жонка вядомага трацкіста Олікера. Жывёлагадоўлю «планірує» былы начальнік сельскагаспадарчага аддзела стаўленік Галенда — Нехай Н. Адказныя пасады займаюць далёка не праверэныя людзі — Касцюковіч і Паходня. Вялікае сумненне выклікае палітычны твар комуніста Кардашэнкі.

Намеснік старшыні Дзяржплана тав. Лапцеў на справе паказаў сябе вузкім дзялягай, чалавекам, які займаецца рэзнымі дробязямі за кошт важнейшых прынцыповых пытанняў. Неразумнае выклікаюць і такія факты, калі Лапцеў неаднаразова браў пад сваю абарону варожых нам людзей (Ешурын, Буніна).

Абураючыя факты шкодніцкага планавання штампаваліся старшынёй Дзяржплана Любовічам і яго намеснікам Лапцевым. Любовіч наогул надзвычай рэдкі госць у Дзяржплане. Начальнікі аддзелаў звязваюцца з ім праз дакладныя запіскі.

Нельга сказаць, каб партарганізацыя Дзяржплана не ведала аб гэтых справах. Частка комуністаў прабавала, праўда, нясмела, заяўляць аб гэтым, але тут не прывыклі прыслухоўвацца да іх голасу. Партком не здолеў узняць гэтыя пытанні на палітычную вышыню, рэзка, па-большэвіцку раздзелацца з бяспечнасцю і дабралушнасцю, якія пануюць у Дзяржплане.

Е. СТОЛІН. І. ТУРЭЦКІ.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

БІЛЬБАО (галоўны горад Баскскай аўтаномнай вобласці). 1 красавіка. (БЕЛТА). Учора зранку на біскайскім фронце (паўночным) мяцежнікі пасля моцнай артылерыйскай падрыхтоўкі павялі наступленне на рэспубліканскія пазіцыі ў сектарах Вільярэаль, Эйбар і Эльгета (на поўнач ад г. Віторыі), увёўшы ў бой значную колькасць добра ўзброеных войск. Дапусціўшы на блізкую аллегласць мяцежнікаў, рэспубліканскія войскі адкрылі моцны кулямётны агонь. Мяцежнікі панеслі вялікія страты. На адным толькі ўзвышшы Каламуа (на ўсход ад Эйбар) на дротавых загародах знойдзена было каля 100 забітых мяцежнікаў.

Не гледзячы на вялікія страты, мяцежнікі, атрымліваючы ўсё новыя і новыя падмацаванні, прадаўжаюць атакаваць пазіцыі рэспубліканскіх войск.

Адначасова з пачатым наступленнем 40 самалётаў мяцежнікаў бамбардыравалі Дуранго (на захад ад Эйбар), Элорыо (на паўднёвы захад ад Эйбар) і Очандыно (на поўнач ад Вільярэаль). Разбурана шмат дамоў. Забіта больш 130 мірных жыхароў, шмат раненых.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 1 красавіка. (БЕЛТА). Як перадаюць з Іспаніі, рэспубліканскія войскі на фронце Кардовы (горад на поўдні Іспаніі) прасунуліся амаль на 20 кіламетраў. Рэспубліканцы прадаўжаюць наступленне на Пеньяроя, Эспіэль і Вільяарта (на поўнач ад Кардовы).

АГЕНТЫ ГЕСТАПО Ў ПОЛЬШЧЫ

У ВАЛЫНСКІМ ВАЯВОДСТВЕ ВЫЖРЫТА ФАШЫСЦКАЯ ТЭРАРЫСТЫЧНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ

ВАРШАВА (сталіца Польшчы), 1 красавіка. (БЕЛТА). Газеты «Ілюстраваны кур'ер подзенны» і «Гонец варшаўскі» змясцілі вялікае паведамленне аб тым, што польскай паліцыяй ліквідавана нелегальная фашысцкая тэрарыстычная арганізацыя «УНАКОР» («Украінская народная казацкая арганізацыя»), якая існавала на тэрыторыі Валынскага ваяводства.

«Гонец варшаўскі» піша: «УНАКОР» ставіла сабе мэтай падрыхтоўку ўзброенага паўстання супроць польскай дзяржавы пры падтрыманні адной з суседніх дзяржаў. У арыштаваных знойдзены дакументы, якія сведчаць аб цесным супрацоўніцтве данай арганізацыі з «ОУН» (фашысцкая арганізацыя ўкраінскіх нацыяналістаў, кіруемая Канавальцам). На чале «УНАКОР» стаяў Ян Валошын, былы палкоўнік войск гетмана Скарападскага. Арганізацыя насіла строга ваенны характар. Валошын прысвоіў сябе званне «атамана». У апошні час была праведзена рэарганізацыя з мэтай падрыхтоўкі «УНАКОР» да надыходзячага, нібыта ў хуткім часе паўстання».

Далей «Гонец варшаўскі» паведамляе, што да гэтага часу арыштаваны 43 кіраўнікі «УНАКОР» і што ў адным толькі Гарохаўскім павеце, Валынскага ваяводства гэта арганізацыя налічвала 700 членаў. Адзін з арыштаваных членаў «УНАКОР» абвінавачваецца адначасова ў забойстве польскага паліцэйскага. У часе вобыскаў у членаў «УНАКОР», паведамляе газета, знойдзена вялікая колькасць зброі і боепрыпасаў. «Гонец варшаўскі» саромліва ўмоўчвае, аб якой «суседняй дзяржаве» ідзе гутарка.

У сувязі з гэтым неабходна адзначыць, што яшчэ ў пачатку лютага гэтага года польскі журнал «Однова» змясціў артыкул, які выкрывае падрыўную дзейнасць украінскіх фашыстаў, членаў «УНАКОР», а таксама той факт, што гэта іх дзейнасць кіравалася і фінансавалася з Берліна (сталіцы Германіі).

„ВЫНАХОДКА" РЫБЕНТРОПА

Патрабаванне Рыбентропа прыняць рашучыя меры супроць «нескромнасці» еўрапейскага друку прымусіла вхуюць членаў Камітэта па неўмяшанню. Многія дэлегаты ледзь стрымліваліся ад моцнага рогату.



Мал. Я. Кашкеля.

Праследванне культурных арганізацый

ВАРШАВА (сталіца Польшчы), 31 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе орган партыі польскіх сацыялістаў (ППС) «Робітнік», паліцыяй у Самборы (Львоўскае ваяводства) апячатана адзяленне асветнай арганізацыі «ТУР» (таварыства рабочага ўніверсітэта), якая знаходзіцца пад уплывам ППС. Газета «Гонец варшаўскі» паведамляе аб закрыцці ў Келецкім ваяводстве аддзялення яўрэйскай «Культур-лігі».

Як паведамляе газета «Валька люду» ў Лодзі закрыт штотыднёвык «Хлопске жыце господарске», які быў органам саюза сялянскай моладзі.

ЯПОНСКІ ДРУК АБ РОСПУСКУ ПАРЛАМЕНТА

ТОКІО (сталіца Японіі), 1 красавіка. (БЕЛТА). Сёння ўсе газеты прысвяцілі перадавыя артыкулы роспуску ніжняй палаты (парламента). Пры гэтым яны лічаць патрэбным гаварыць аб недахопах і памылках палітычных партый, ускладаючы на іх долю адказнасці за створанае становішча. Газеты асуджаюць дзеянні ўрада, заяўляючы, што ён невядома для чаго кінуў выклік палітычным партыям. Разам з тым газеты ў вельмі асцярожнай форме намякаюць, што роспуск ніжняй палаты з'яўляецца ні чым іншым, як першым крокам да выканання загадзя намечанага плана стварэння новай урадавай партыі, аснаванай на «таталітарызме» (фашысцкай партыі). Газеты ўказваюць, што ўрад Хаясі да запвярджэння бюджэта дабіваўся супрацоўніцтва партый, але як толькі бюджэт быў прынят, ён нечакана змяніў тактыку, звярнуўшыся да роспуску парламента.

«Міяко» — адзіная газета, якая ўказвае ў перадавым артыкуле, што роспуск ніжняй палаты сведчыць аб «выключным уплыве ваеннага і морскага міністра».

***

Роспуск японскім урэдам ніжняй палаты парламента і назначэнне новых выбараў адбыліся якраз перад самым закрыццём сесіі парламента. Урад Хаясі абвінавачвае ніжнюю палату ў «няшчырасці», у «неразуменні адказных задач цяперашняга складанага моманту».

Урадавая дэкларацыя гаворыць аб тым, што кабінет Хаясі «прымушан апеліраваць да справядлівага сумлення нацыі».

За гэтымі пышнымі фразамі хаваюцца вельмі цвярозыя намеры.

Пануючая ў Японіі ваеншчына імкнецца пакончыць з астаткамі парламентарызма ў краіне, пакончыць нават з куцай, урэзанай канстытуцыяй і паследваць прыкладам «прыяцеляў» з Германіі аб устаўленні фашысцкай дыктатуры.

Распушчаная ніжняя палата была своеасаблівым бяльмом на вачах ваенных колаў краіны. Амаль уся парламенцкая сесія прайшла ў абстаноўцы рэзкай крытыкі палітыкі раней ўрада Хірота, а потым Хаясі. Тэрацці — ваенны міністр у былым кабінеце — яшчэ ў пачатку гэтага года патрабаваў роспуску непаслухмянага парламента.

Урад Хірота ў сувязі з канфліктам з палатай прымушан быў адыйсці. Аднак новы ўрад Хаясі, створаны па настаянню ваенных колаў, сустрэў з боку партый парламента такую-ж рэзкую апазіцыю.

Гэта барацьба ў кіруючым лагеры Японіі, барацьба паміж ваеншчынай і парламенцкімі партыямі аллюстроўвае рост антыфашысцкіх і антываенных настрояў у краіне, нездавальненне народных мас курсам на правакацыю вайны, боязнь з боку больш умераных і цвярозых колаў буржуазіі ваеннага разгрому і катастрофы.

Урад Хаясі — рупар агрэсіўных ваенных колаў — дагэтуль не распускаў ніжнюю палату, чакаючы пакуль будзе праведзен новы бюджэт, бюджэт падрыхтоўкі да вайны.

Як толькі гэты бюджэт быў запверджан, лёс парламента быў вырашан.

Ваенныя колы імкнуцца цяпер стварыць новую адзіную фашысцкую партыю, каб ліквідаваць супрацьлеглае сваім планам з боку старых буржуазных партый. Новыя выбары адбудуцца ў гэтым месяцы. Яны, безумоўна, яшчэ больш абвострацць унутраныя супярэчнасці ў краіне. Урад Хаясі зробіць усё, каб падавіць сапраўдную волю выбаршчыкаў, каб стварыць паслухмяны, маўклівы парламент, які без параканняў будзе выконваць волю японскай ваеншчыны, які санкцыяніруе планы правакацыі новай вайны, планы ўцягнення краіны ў новыя небяспечныя авантуры.

МАРЫЯ-ТЭРЭСА ЛЕОН АБ СВАІМ ПРАБЫВАННІ У СССР І АБ ГУТАРЦЫ З таварышам СТАЛІНЫМ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 1 красавіка. (БЕЛТА). Іспанскія пісьменнік Рафаэль Альберці і Марыя-Тэрэса Леон, наведаўшыя нядаўна СССР, прыбылі ў Парыж праездам у Іспанію.

Газета «Сесуар» друкуе вялікі артыкул Марыі-Тэрэсы Леон, у якім іспанская пісьменніца ўказвае, што паездка ў СССР зрабіла на яе найглыбейшае ўражанне. Марыя-Тэрэса Леон адзначае, што ўсё насельніцтва Совецкага Саюза і нават дзеці надзвычай добра паінфармаваны аб падзеях у Іспаніі. Марыя-Тэрэса Леон захоплена гарачай любоўю, якую адчуваюць у СССР да іспанскага народа.

Яна адзначае велізарны ўздым дабрабыту народаў СССР з 1933 года, калі яна ўпершыню наведала Совецкі Саюз.

Марыя-Тэрэса Леон асабліва спыняецца на сваёй гутарцы з таварышам Сталіным. «Самае дзівоснае, — піша Марыя-Тэрэса Леон, — гэта тое, што з ім адчуваеш сябе, як з чалавекам, з якім можна гутарыць, як са знаёмым. Не хістаючыся, гаворыш з ім напрамік, і Сталін адказвае тым-жа, як быццам ён не кіраўнік вялікай дзяржавы, а проста друг. З таго моманту, як Сталін паціснуў вам руку, ён становіцца вашым другам».

СЕНСАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ РУМЫНСКАГА ДРУКУ

БУХАРЭСТ. (сталіца Румыніі), 1 красавіка. (БЕЛТА). Учора румынскі друк апублікаваў пад сенсацыйнымі загалоўкамі наступнае паведамленне:

«Згодна вестак, зараз-жа пасля звароту румынскага міністра замежных спраў Антанэску з Белграда (сталіца Югаславіі) будзе апублікаван акт выключнай важнасці як для нашай краіны і Малой Антанты, так і для ўсёй сістэмы замежнай палітыкі.

Дыпламатычны акт, які будзе афіцыяльна пацверджан ва ўрачыстай абстаноўцы, пакончыць са становішчам, якое пягнецца з дня сканчэння вайны. У афіцыяльных колах лічаць, што апублікаванне вестак, датычных заключэння гэтага акта, будзе мець рашаючыя вынікі для ўнутранай палітыкі нашай краіны».

Гэта паведамленне выклікала шмат толкаў у дыпламатычных колах. Пашырылася чутка, быццам паведамленне мае на ўвазе совецка-румынскія адносіны. Магчыма, што ўсё гэта паведамленне, як і гэта чутка, пазбаўлены ўсякіх падстаў, пушчаны для якіхсьці палітычных мэтаў і з'яўляецца нейчай палітычнай інтрыгай.

ФАШЫЗМ ТРАЦІЦЬ ГЛЕБУ ПАД НАГАМІ

ВАРШАВА (сталіца Польшчы). 1 красавіка. (БЕЛТА). Вядомы сваімі сімпатыямі да фашысцкай Германіі орган кансерватараў «Час» змяшчае паведамленне свайго берлінскага карэспандэнта аб узрастаючым сярод шырокіх мас насельніцтва Германіі нездавальненні фашысцкім рэжымам.

«Гэта нездавальненне, — адзначае карэспандэнт, — у сучасны момант куды больш можна заўважыць, чым, скажам, поўгода таму назад. Яно тлумачыцца многімі прычынамі». «Час» указвае, што абяцанні Гітлера, даныя ім яшчэ да яго прыходу да ўлады, не выкананы. «Лепшым доказам гэтага з'яўляецца той факт, што заработная плата рабочых у сярэднім знізілася на 13 проц. у параўнанні з 1932 годам, не гледзячы на тое, што кошт утрымання рабочай сям'і за той-жа перыяд часу ўзрос прыкладна на 30 проц. Апрача таго, кідаюцца ў вочы частыя факты злоўжывання ўладай з боку партыйных саноўнікаў».

Карэспандэнт адзначае таксама, што штодзень у правінцыяльным германскім друку з'яўляюцца паведамленні аб высылцы комуністаў у канцэнтрацыйныя лагеры.

У Менскім палацы піянераў і экскурсантаў 6-га класа 5-й школы г. Менска Таня Лапшова заканчвае скульптуру «Парашутыстка». НА ЗДЫМКУ: юны скульптар, вучаніца Фото В. Вернера (БСФ).

СЯМ'Я КАЗІМІРАВЫХ

У мінулым годзе ў сям'і цыгана Казіміра адбылася вялікая перамена. Яна назаўсёды адмовілася ад вандроўнага жыцця.

Сям'я Казіміра жыве зараз у калгасе «Ленінскі шлях», Каропкаўскага сельсовета, Кармянскага раёна. Урад БССР выдаў Казіміраву грашовую дапамогу ў суме трох тысяч рублёў. За гэтыя грошы Казіміравы купілі сабе хату, карову і шмат мэблі.

Нядаўна сям'я атрымала дзяржаўную дапамогу па шматсямейнасці. За атрыманыя грошы ад дзяржавы Казіміравы набылі сабе шмат вопраткі.

За трыма блізнятамі Казіміравых наладжан медыцынскі догляд. Некалькі раз у месяц іх праглядаюць урачы. Блізняты прыбаўляюцца ў вазе, усе яны здаровыя і бадзёрыя. Усіх дзяцей у Казіміраў восем. Старэйшыя трое навучаюцца ў школе.

У доме Казіміравых зусім не так, як было некалі ў час вандроўнага жыцця ў шатры. Кватэра абстаўлена добрай мэбляй, прыгожа выклеены шпалерай сцены хаты.

Сям'я цыгана акружана клопатамі. Вельмі часта хату Казіміравых навяшчаюць раённыя партыйныя і совецкія работнікі. Зачастую ў гутарцы Фядора Сямёнаўна Казіміраў кажа:

— Ранейшае маё вандроўнае жыццё было поўна пакуты. Зараз мы выйшлі на шлях светлага і радаснага жыцця. За бацькаўскія клопаты аб нас, цыганах, я дзякую вялікаму і дарагому Сталіну.

І. КАВАЛЁЎ.

ДАСТОЙНЫ УЧЫНАК ГЛУХАНЯМОГА

Раённая газета «Калгаснік на варце» (Лельчыцы) паведамляе аб дастойным учынку глуханямога тав. Гаўрылаўца. На раце Убарць на маленькай лодцы з вялікім шастом у руках пад'язджаў да плытоў сплаўшчык. Але раптам ён страціў роўнавагу і ўпаў у рэчку, зачапіўшыся адной нагой за лодку.

Яму на дапамогу, адчапіўшы плыт, кінуўся другі сплаўшчык. Але ён забыў узяць з сабой шост, і яго плыт пачало адносіць у другі бок.

Недалёка праязджаў на лодцы глуханямы тав. Гаўрылавец. З берага яму пачалі паказваць знакамі аб здарыўшайся небяспецы. Гаўрылавец гэта заўважыў і адразу-ж пад'ехаў да ўтапаючага. З рыстам для сябе ён выцягнуў сплаўшчыка з вады.

ПУЦЁЎКІ НА КУРОРТЫ КРЫМА І КАЎКАЗА

Беларуская курортная кантора атрымала на бягучы год 3.363 пуцёўкі ў санаторыі Паўночнага Каўказа, Крыма, Украіны і Абхазіі замест 2.700 пуцёвак у мінулым годзе. Апрача таго атрымана 1.600 курсовак. Асноўная колькасць пуцёвак закуплена профсаюзнымі, ваеннымі і іншымі арганізацыямі.

ЗАКОНЧАНА РЭАЛІЗАЦЫЯ БІЛЕТАЎ XI ЛАТАРЭІ АСОАВІЯХІМА

2 красавіка, за месяц да вызначанага тэрміну, па БССР закончана рэалізацыя білетаў XI латарэі Асоавіяхіма. Рэалізавана білетаў на 3.200 тыс. руб. Першымі ў рэспубліцы рэалізавалі латарэйныя білеты Барысаўскі, Заслаўскі, Гомельскі і Бабруйскі раёны. ЦС Асоавіяхіма БССР зрабіў поўны разлік за рэалізаваныя білеты з ЦС Асоавіяхіма СССР.

Совецкая Беларусь па рэалізацыі білетаў латарэі заняла чацвертае месца ў Совецкім Саюзе. (БЕЛТА).

НОВЫ ЧАЧЭРСК

У апошні час у мястэчку Чачэрск многа зроблена па дабрабыту. На былой базарнай плошчы пабудован помнік В. І. Леніну, ён стаіць сярод маладога сквера. Старыя, пахіліўшыяся на бок гандлёвыя будынкі знесены з гэтай плошчы. На іх месцы пабудаваны два новыя выдатна абсталяваныя універмагі.

У канцы мястэчка адведзен пляц для калгаснага базару. Кожны выходны дзень тут поўна калгаснікаў, якія прадаюць мяса, малако, яйкі, хлеб, бульбу і інш. Усе раймагі мястэчка набылі культурны выгляд, адкрылася новая вялікая цырульня. На вуліцах зроблены тратуары. Устанаўляецца гукавое кіно ў доме соцкультуры, а ў парку абсталявана фізкультурная пляцоўка.

П. СІДАРАЎ.

СКОНЧАНА СЛЕДСТВА ПА СПРАВЕ ЗАБОЙСТВА МАСТАКА Ю. М. ПЭЧА

Органамі НКУС міліцыі і пракуратуры БССР скончана следства па справе зверскага забойства вядомага мастака Юрыя Майсеевіча Пэча, зробленага 28 лютага г. г. у г. Віцебску.

Да судовай адказнасці прыцягнуты 9 чалавек: Файнштэйн Лея (стрыечная сястра Ю. М. Пэча), яе муж Файнштэйн Рувім, дзеці іх — Абрам, Нэха, Рыва, Залман і Шлёма, зяць Файнштэйна Саламонік Мордух і студэнт КІЖ'а Оліфсон Міхаіл.

Следствам устаноўлена, што натхніцелем і арганізатарам гэтага зверскага забойства з'яўляецца Файнштэйн Лея. Фізічным выканаўцам — Абрам і Нэха Файнштэйн.

Абрабаванне Ю. М. Пэча і авалоданне яго маемасцю падрыхтоўвалася гэтай групай яшчэ з восені мінулага года. Іх замысел быў паскоран у сувязі з прыездам камісіі Камітэта мастацтваў пры СНК СССР да Пэча, які пажадаў перадаць свае мастацкія творы дзяржаве.

Забойцы ў зробленым злачынстве сазналіся. У іх знойдзена частка грошай, якія яны забралі пры забойстве мастака.

Справа пераадаецца на разгляд у Вярхоўны суд БССР. У бліжэйшыя дні ў гор. Віцебску ў закрытым судовым пасяджанні з удзелам дзяржаўнага абвінаваўцы і абароны будзе заслухана гэта справа.

СУД

ШКОДНІКІ НА ТРАНСПАРЦЕ

МАГІЛЕЎ. (Кар. «Звязды»). 28—30 сакавіка лінейны суд Беларускай чыгункі на ст. Магілеў разглядаў справу шкодніцкай групы, якая вяла падрыўную работу ў Крычаўскім вагонным пункце. Майстар вагоннага пункта Корсун разам з раскулачаным Дамарацкім, антысовецкімі элементамі Бабушкіным і Судзенковым пры патуранні парторга Сергеева сістэматычна прапускалі на ст. Орша вагоны з вялікімі дэфектамі, пасылаючы фіктыўныя акты, быццам вагоны агледжаны. За час са снежня 1936 г. па 10 сакавіка 1937 г. яны прапусцілі 227 хворых вагонаў. 4 сакавіка ў рэзультаце гэтага адбылося крушэнне поезда. Было разбіта 6 і пашкоджана 18 вагонаў. 2 праваднікі былі ранены, прычым адзін з іх памёр.

Лінейны суд прыгаварыў арганізатара шкодніцкай групы Корсуна да расстрелу, саўдзельнікаў — Бабушкіна да 10 год зняволення ў турме, Дамарацкага да 7 год, Судзенкова да 5 год, парторга Сергеева да 2 год. Усіх з пазбаўленнем у правах на 3 гады пасля адбыцця пакарання.

Р. ДОДЗІН.

РАЗЛІЎ ПРЫПЯЦІ

МАЗЫР. 2 красавіка. (Кар. «Звязды»). За апошнія дні прыток вады ў Прыпяць рэзка павялічыўся. Сёння ўзровень вады падняўся 304 сант. у Тураве і 249 сант. у Мозыры. Вялікі прыток вады выклікаў разліў Прыпяці ў шырыню на 2—3 кіламетры. Гэта акалічнасць узрадавала калгаснікаў, паколькі вялікі разліў рэкі забяспечвае добры ўраджай заліўных лугоў.

Р. ФРАЛОЎ.

ЗДАРЭННІ

◎ **Вацьна-кат.** Жыхар вёскі Галавачы Магільнянскага сельсовета, Уздзенскага раёна Галубцоў Сымон, страціўшы чалавечае аблічча, нечуванымі метадамі катаваў і здзекваўся над сваім 6-гадовым хлопчыкам Валодзям. Ён прымушаў яго выконваць самыя цяжкія работы і вельмі часта збіваў да сінякоў і рубцоў на целе. Улюбёным і найбольш частым метадам Галубцова было катаванне сына на гарачай печы. Ён напальваў да чырвані печ, ставіў Валодзю босымі ножкамі на самае гарачае месца і трымаў, пакуль на ножках у дзіцяці не паяўляліся пухіры. Валодзя зараз накіраван у райбольніцу для лячэння ад апёкаў. Галубцоў арыштаван і аддан пад суд.

ДЗЁННІК

Заняткі гурткоў па гісторыі партыі і ленінізма адбудуцца 3 красавіка ў 7 гадзін вечара ў памяшканні Дома партактыва (пакой № 17, 21).

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

У ТЭАТРАХ І КІНО:

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1).
3 красавіка АПОШНІЯ
Абанем. № 73.

Памяшк. Дзярж. Яўрэйск. тэатра
БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
3 красавіка КАНЁК-ГАРБУНОК
Абанемент № 8

Гукавы кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
ДЭПУТАТ БАЛТЫКІ

Дзіцячы гукавы кінотэатр
ДЗЕЦІ КАПІТАНА ГРАНТА
Кінохроніка № 15.

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
ЗОРЫ ПАРЫЖА
ПАЧАТАК СЕАНСАЎ: 4, 7, 9 і 11 гадзін вечара.

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
ВАРОЖЫЯ СЦЕЖКІ

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 3 КРАСАВІКА:

8.30 — «Апошнія паведамленні». 16 — канцэрт. 17 — перадача для дзяцей. 18.30 — партвучоба. 20 — перадача ў дапамогу радыёаматарам. 20.15 — канцэрт. 21 — яўрэйская совецкая паэзія. 22 — мастацкая самадзейнасць. 23 — «Апошнія паведамленні». 23.15 — «Апошнія паведамленні» на польскай мове.

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 4 КРАСАВІКА:

8.30 — «Апошнія паведамленні». 13.15 — аграгутарка. 13.30 — перадача на польскай мове. 14.20 — канцэрт. 16 — камерны канцэрт з твораў Баха і Гендэля. 17 — перадача для дзяцей. 17.35 — «Апошнія паведамленні». 18.30 — літаратурная перадача. 19 — канцэрт. 20 — даклады і выступленні. 20.15 — урыўкі з оперы «Дэмон». 20.30 — партвучоба. 23 — «Апошнія паведамленні».

КІРАЎНІЦТВУ МЕНВОДАКАНАЛІЗАЦЫІ
патрабуецца вопытны ІНЖЫНЕР-МЕХАНІК.
Звяртацца на адрасу: Гіржавы завулак № 1.
МЕНВОДАКАНАЛІЗАЦЫЯ.

СКУЛЬПТУРНЫЕ МАСТЕРСКИЕ ЦПКиО им. М. ГОРЬКОГО г. МОСКВА
ИЗГОТОВЛЯЮТ: СКУЛЬПТУРУ, ВАЗЫ, ХУДОЖЕСТВ. МОЗАИКУ
ПО ТРЕБОВАНИЮ ВЫСЫЛАЮТСЯ БЕСПЛАТНЫЙ ПРЕЙС-КУРАНТ И ЗА ПЛАТУ 4 РУБЛЯ — ИЛЛЮСТРИРОВАННЫЙ ПРОСПЕКТ
АДРЕС: МОСКВА, БОЛ. ПИРОГОВСКАЯ, №2 (БЫВШ. НОВО-ДЕВИЧИЙ МОНАСТЫРЬ)
ТЕЛЕГРАФН. АДРЕС: МОСКВА-ЦЕНТРОСКУЛЬПТУРА

Конзаводу № 90
патрабуюцца садоўнік-гароднік і прараб-будаўнік.
Аплата па згодзе.
Звяртацца: Церахоўскі раён, конзавод № 90.

ЗГУБЛЕНЫЯ І ЎКРАДЗЕНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНЫМІ:
Крэпскі В. І. — права шофера; Юдовіч Я. І. — комсамольскі білет № 06578; Майзель Б. Ш — пенсійная кніжка; Горскі Л. П. — пашпарт і віза; Бародзін А. Д. — ваенны білет; Янава Г. І. — пашпарт; Эльвоў-Эдвінаў М. Н. — пашпарт № 246190; Эйг Б. Х. — пропуск Дзяржбанка № 16; Шахпай І. М. — пропуск НКУС; Горскі Л. П. — профбілет;

МАСКОЎСКІ ПАЛІГРАФІЧНЫ ІНСТЫТУТ
Масква, вул. Кірава, 21.
праводзіць АСЕННІ НАБОР студэнтаў
НА ПЕРШЫ КУРС АГУЛЬНА-ТЭХНІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА.
Інстытут рыхтуе інжынераў-тэхнікаў паліграфічнай прамысловасці.
Тэрмін навучання 5 год.
Пры падачы заяў прадстаўляюцца дакументы згодна правілаў прыёму ў ВТНУ на 1937 г.
На час іспытаў усе паступаючыя (іншагароднія) забяспечваюцца інтэрнатам.
Прынятыя ў інстытут інтэрнатам і стыпендыяй забяспечваюцца на агульных падставах.

ШВЕЙНАЯ ФАБРЫКА „КІМ"
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ЗАКАЗЧЫКАЎ, ЯКІМ ПАСЛАНЫ ПАПЕРАДЖАЛЬНЫЯ ПІСЬМЫ АБ АТРЫМАННІ ЗАКАЗАЎ,
— ШТО —
ЗАКАЗЫ САПРАЎДНЫ да 15 КРАСАВІКА 1937 г.
ЗАКАЗЫ, ЗДАНЫЯ Ў 4-м КВАРТАЛЕ 1936 Г., ПАВІННЫ БЫЦЬ АТРЫМАНЫ НЕ ПАЗНЕЙ УКАЗАНАГА Ў КВІТАНЦЫІ ТЭРМІНУ.
ПАСЛЯ УКАЗАНЫХ ТЭРМІНАЎ ЗАКАЗЫ АНУЛЮЮЦЦА І НІЯКІЯ ПРЭТЭНЗІІ ПРЫМАЦЦА НЕ БУДУЦЬ.
ПРЫ АТРЫМАННІ ЗАКАЗА НЕАБХОДНА ПРАДСТАВІЦЬ КВІТАНЦЫЮ.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

Уп. Галоўлітбела № А—691. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63.

К. К. С.